ХАРЧАВАННЕ ПА ІТ
8

ШТО ВЫЛУЧАЕ ІЎЕ
9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 СТУДЗЕНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 10 (29632)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксей БАГДАНАЎ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:

«У краіне стаіць задача змагацца менавіта з неабгрунтаваным пасрэдніцтвам, і ні ў якім разе нельга кашмарыць бізнес і ўстараняць пасрэднікаў, якія сапраўды неабходныя. Праект указа, які дакладваўся кіраўніку дзяржавы, якраз накіраваны на тое, каб удасканаліць сістэму барацьбы. Бізнес нармальны, і адэкватны ёсць, і патрыятычны, які сапраўды шмат укладвае ў развіццё нашай дзяржавы. І той жа гандаль таксама можна назваць пасрэднікам паміж вытворцамі і пакупнікамі. Але гэта нармальны пасрэднік, які выконвае правільную функцыю. Задача ў тым, каб паміж вытворцам і канчатковым спажыўцом быў як мага меншы ланцужок пасрэднікаў».

Памяць ганчарнага круга

Фота БелТА.

У вёсцы Гарадная Столінскага раёна ганчарным майстэрствам займаюцца не адно стагоддзе: раней — для побыту і заробку, зараз жа ўсё больш для душы — з цікавасці да сваёй гісторыі і жыцця продкаў. Створаны амаль два дзясяткі гадоў таму на грант спецыяльнага фонду Прэзідэнта пры мясцовым Доме культуры Цэнтр ганчарства не даў згаснуць агню ў горне і зараз дапамагае нараджэнню новай плеяды гараднянскіх майстроў. За значны асабісты ўклад у захаванне традыцый ганчарнага рамяства кіраўнік цэнтра Васіль КАЗАЧОК (на фота) нядаўна з рук кіраўніка дзяржавы атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтваў.

КАРАТКА

• У Нацыянальным аэрапорце Мінск з узлётна-пасадачнай паласы выкацiўся самалёт Airbus A-320, які выконваў рэйс Ташкент–Мінск. Па папярэдніх даных, пацярпелых няма. Паветранае судна ў выніку інцыдэнту не пашкоджана.

• **Нацыянальныя геапаркі з'явяцца ў Беларусі.**

• Палова працоўных беларусаў атрымлівае больш за Br1096.

• **Другая стадыя чэмпіянату Беларусі па хакеі стартуе 20 студзеня.**

• Індывідуальныя прадпрымальнікі будуць выплачваць адзіны падатак па новых стаўках з 1 лютага 2022 года.

ISSN 1990 — 763X

Камунальныя стасункі

КАБ ВАДЫ НАПІЦЦА, ТРЭБА ЁЙ ПАКЛАНІЦЦА

Дзе ўзяць 11 мільярдаў на «малады» водаправод для краіны?

Чыстая і якасная пітная вада павінна быць у доме кожнага беларуса — гучыць як аксіёма. Для гэтага ў краіне будуюць станцыі абезжалезвання, робяць водазаборныя свідравіны, падключаюць гарады і пасёлкі да цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння... І вось якраз гэтыя самыя сістэмы і хаваюць адну з галоўных водных праблем. У Беларусі эксплуатуецца больш за 40 тысяч кіламетраў водаправодных сетак і амаль 18 тысяч — каналізацыйных. Пры гэтым больш як траціна з іх мае звышнарматыўны тэрмін выкарыстання. А каб замяніць усе зношаныя сеткі, спатрэбіцца больш за 11 млрд рублёў, перакананы спецыялісты галіны.

СТАР. 7

Высокія тэхналогіі

АПАРАТ НА МІЛЬЁН, А КАРЫСЦІ — ГРАШЫМА НЕ ПАМЕРАЦЬ

На Гомельшчыне ў арсенале медыкаў — чарговае папаўненне. Два кабінеты камп'ютарнай тамаграфіі адкрыты ў рэгіёне з пачатку года: у Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы № 2 і Чачэрскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Адкрыццё кабінета камп'ютарнай тамаграфіі ў Чачэрскай цэнтральнай раённай бальніцы.

СТАР. 11

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Асобныя гарачыя галовы ўжо адкрыта заклікаюць да вайны. Мы чуем гэтыя заявы»

Прэзідэнт Беларусі зацвердзіў задуму сумеснага аператыўнага вучэння Узброеных Сіл Беларусі і Расіі «Саюзная рашучасць – 2022»

Адмысловы план і шэраг пытанняў па забеспячэнні бяспекі Саюзнай дзяржавы абмеркавалі на сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам кіраўнікі ваеннага ведамства. Правесці сумесныя пазапланавыя мерапрыемствы па ацэнцы гатоўнасці Узброеных Сіл Саюзнай дзяржавы кіраўнікі дзвюх краін дамовіліся яшчэ ў снежні. Вызначаны мэты, задачы, склад удзельнікаў і месцы практычных дзеянняў войскаў. Кіраўніком вучэнняў з беларускага боку назначаны начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Віктар ГУЛЕВІЧ.

Па звестках Прэзідэнта, гэтым часам на граніцы з Беларуссю ў Прыбалтыйскіх краінах і Польшчы знаходзіцца больш за 30 тысяч ваеннаслужачых з тэхнікай, узбраеннем. У гэтым кантэксце ён згадаў перагаворы Расіі з НАТА. «Расія мае рацыю, што тыя (прадстаўнікі НАТА. — **«Зв.»**) хочуць завалакіціць, замяць усе гэтыя перагаворы, ідэі і падаць, быццам бы нічога не адбываецца. Мы бачым, што адбываецца. Варшава звярнулася ў НАТА з просьбай разгарнуць у дадзеным рэгіёне шматэшаланіраваную сістэму тылавога і тэхнічнага забеспячэння. Як людзі ваенныя, мы адразу задаём пытанне: навошта?» — акцэнтаваў кіраўнік краіны.

Па словах Прэзідэнта, калі цяжкім узбраеннем і вайсковым кантынгентам меркавалі змагацца з наплывам мігрантаў, то зараз магчыма адсунуць ад межаў ваенных.

«Памятаеце, так і мы калісьці перад, пасля выбараў рэагавалі. Мы ім паказвалі: хлопцы, сунецеся — будзе дрэнна. Мы свае войскі потым вывелі ў месцы пастаяннай дыслакацыі. А яны, больш за тое, вылучыўшы сюды войскі і ўзбраенне, стваралюць шматэшаланіраваную абарону, вылучаюць эшалоны, тылавое забеспячэнне, гэта значыць, рыхтуюцца да нечага сур'ёзнага. Прынамсі, працяглага», — заўважае Аляксандр Лукашэнка.

Ён дадаў, што таксама на тэрыторыі Польшчы і краін Балтыі на ратацыйнай аснове знаходзяцца ад 8 да 10 тысяч ваеннаслужачых Злучаных Штатаў Амерыкі.

«Амерыканцам што тут рабіць? Чаго нас, Расію папракаць, што мы тут нейкія маневры, вучэнні праводзім, калі вы за край свету сюды перліся, што вы тут рабіць будзеце? Асобныя гарачыя галовы ўжо адкрыта заклікаюць да вайны. Мы чуем гэтыя заявы», — канстатаваў Прэзідэнт.

Ён адзначыў: на вялікі жаль насцярожвае абстаноўка і на паўднёвых рубяжах — то-бок з Украінай. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, Украіна працягвае нарошчваць сілы, засяроджваючы падраздзяленні нацыянальнай гвардыі з «нацыяналістаў-радыкалаў».

«Гэта ўсё ў непасрэднай блізкасці да дзяржаўнай граніцы нашай краіны. Зноў жа пад выглядам таго, што будуць змагацца з мігрантамі. Ды мігранты туды ў жахлівым сне не трапяць нават. Яны не збіраюцца ва Украіну ісці. Там свае людзі бягуць з Украіны. А яны будуць абараняцца ад мігрантаў з Беларусі...» — адзначыў Прэзідэнт.

У спецаперацыі ўкраінскіх ваенных «Палессе» задзейнічана на мяжы амаль 10 тысяч ваеннаслужачых, а раней было толькі шэсць тысяч, дакладвае Прэзідэнту разведка.

«Дынаміка такая, што ідзе нарошчванне ваеннага кантынгенту на паўднёвых граніцах нашай краіны», — сказаў Прэзідэнт.

Ён нагадаў пра планы з расійскім калегам правесці сумесныя пазапланавыя мерапрыемствы на заходніх, паўднёвых межах Саюзнай дзяржавы.

«Сёння мы бачым, што нам неабходна ў гэтых заходніх, паўднёвых рэгіёнах Беларусі, «беларускім балконе» правесці салідныя вучэнні. І гэтыя вучэнні не павінны быць чыста беларускімі. Гэта павінны быць нармальныя вучэнні па адпрацоўцы пэўнай задумы ў супрацьстаянні з гэтымі сіламі — захаду (Прыбалтыка, Польшча) і поўдня (Украіны)», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Міністрам абароны Беларусі і Расіі была пастаўлена задача прапрацаваць задуму вучэння, вызначыць колькасць войскаў і ўзбраення, якое мабілізуюць у Беларусі, і якія часці будуць падключаны з Расіі.

Па словах Прэзідэнта, вучэнні запланаваны на люты. «Вызначайце дакладную дату, паведамляйце, каб нас не папракалі, што мы тут ні з сяго ні з таго нейкія войскі сцягнулі і ледзь ваяваць не збіраемся», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Падрабязней пра вучэнні і дыслакацыю войскаў на граніцах краін-суседак расказалі журналістам генералы.

Намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл — начальнік галоўнага аператыўнага ўпраўлення Павел МУРАВЕЙКА расказаў, што ў рамках дзвюх ваенных аперацый НАТА «Атлантычная рашучасць» і «Узмоцненая перадавая прысутнасць» у Еўропе разгорнута больш за 12 тысяч амерыканскіх салдат са зброяй, танкамі, артылерыяй, самалётамі і верталётамі. Ахоўваюць паветраную прастору Балтыі больш за 300 ваеннаслужачых, 6—8 самалётаў Ф-16 і Ф-35.

«Гэта не можа нас не насцярожваць, бо гэтай групоўкай сёння магчыма развязаць і справакаваць любы міжнародны канфлікт. Акрамя таго, сёння працягваецца рэзнанснае правакацыя, выкліканая так званым міграцыйным крызісам. Толькі ў рамках дадзенай дзейнасці на тэрыторыі памежных з намі дзяржаў разгорнута больш за 20 тысяч ваеннаслужачых. З іх 15 тысяч — прадстаўнікі сухапутных войскаў. У Прыбалтыцы больш 12 тысяч ваеннаслужачых. Гэта прадстаўнікі арміі, паліцыі, прыгранічнай службы», — паведаміў генерал-маёр.

Згодна з аперацыяй «Палессе», на граніцах Украіны з Беларуссю размешчана больш 10 тысяч ваеннаслужачых, і нарошчванне дадзенай групоўкі працягваецца, адзначае спікер.

«Гэта выклікае занепакоенасць і патрабуе ад нас аб'ектыўнай рэакцыі ў адказ. Гэта рэакцыя будзе адэкватная і празрыстая. Мы сумесна з расійскімі калегамі правядзём нечаканую праверку сіл і сродкаў рэагавання Саюзнай дзяржавы, — адзначыў Павел Муравейка. — Разам з тым на завяршальным этапе дадзенага мерапрыемства пройдзе вучэнне, задуму якога сёння зацвердзіў Прэзідэнт. Назва вядома — «Саюзная рашучасць — 2022». Склад войскаў вучэння, а таксама тэрміны яго правядзення будуць удакладнены па меры рэалізацыя мерапрыемстваў праверкі».

Нарошчванне войска на межах з-за міграцыйнага крызісу ён назваў «рэзнанснай правакацыяй» Польшчы невыпадкова, бо пагрозы з-за бежанцаў не маюць нічога агульнага з працэсамі, што адбываюцца ў краіне-суседцы.

«Жадаючы прадэманстраваць сваю патрэбнасць Еўропе, узровень сваёй адказнасці перад еўрапейскімі краінамі, свае фінансавыя ўкладанні ў забеспячэнне бяспекі Еўропы, Польшча вылучае як мага больш ваенных, дэманструючы свой патэнцыял. Колькасць мігрантаў ні ў якім разе не ўплывае на колькасць ваеннаслужачых, што там знаходзяцца, — дадае Павел Муравейка. — Тут маецца нейкі больш глыбінны падыход — дэманстрацыя сваёй гатоўнасці выконваць нейкія задачы. Якія задачы могуць выконваць польскія ваенныя каля нашых граніц? Толькі правакацыйныя».

Начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Віктар Гулевіч адной з рызык ваеннай бяспекі Беларусі назваў прысутнасць войскаў НАТА на тэрыторыі краін, што мяжуюць з нашай. Таму кіраўнікамі Саюзнай дзяржавы, па яго словах, прынята рашэнне аб правядзенні праверкі сіл рэагавання.

«У рамках мерапрыемства прадугледжана выкананне шэрагу задач. Праверцы падлягаюць органы кіравання, аб'яднанні, злучэнні воінскіх часцей Беларусі і Расіі. Будзе праводзіцца перагрупоўка на тэрыторыю Беларусі вялікага кантынгенту, з якім будзе адпрацоўвацца шэраг задач па абароне Саюзнай дзяржавы: на паўднёвым напрамку ў паветранай прасторы і на сушы, выкананне задач барацьбы з дыверсійна-разведвальнымі групамі, незаконнымі ўзброенымі фарміраваннямі. Будзе праведзена праверка ваенна-лагістычнай сістэмы па забеспячэнні перагрупоўкі на вялікія адлегласці», — расказаў начальнік Генштаба. Праверка сіл рэагавання пройдзе ў два этапы.

Марыя ДАДАЛКА.

«ВЫ ВЫБРАЛІ ТАКУЮ ПРАФЕСІЮ, А ЧАС ВЫБРАЎ НАС»

У суботу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на аэрадроме Мачулішчы пад Мінскам сустрэўся з міратворцамі, што прыбылі з Казахстана, паведамляе прэс-служба кіраўніка краіны.

У сваім выступленні перад байцамі Прэзідэнт адзначыў, што падзеі ў брацкай рэспубліцы — чарговая спроба знешняга ўмяшання ва ўнутраныя справы незалежных дзяржаў, а пагрозы, з якімі сутыкнуўся Казахстан, з'яўляюцца агульнымі для большасці дзяржаў на постсавецкай прасторы.

«Сваімі дзеяннямі, няхай без стральбы, без правядзення спецыяльных аперацый, толькі сваёй прысутнасцю ў гэтай краіне вы забяспечылі мір і парадак. Гэта быў сігнал усім, хто сёння точыць меч па перыметры беларуска-расійскіх граніц, — упэўнены Прэзідэнт. — Вы паказалі ўсім, што з намі ваяваць небяспечна. Больш за тое, немагчыма. Нас перамагчы немагчыма. Гэта галоўны вынік вашай аперацыі».

Арганізатары мяцяжу, заявіў у суботу Аляксандр Лукашэнка, мелі намер падарваць сітуацыю ў цэнтральнаазіяцкай рэспубліцы і ў цэлым дэстабілізаваць абстаноўку па перыметры Расіі, каб яе аслабіць. Прынятыя па лініі АДКБ меры дазволілі зберагчы Казахстан ад развіцця сітуацыі па самым негатыўным сцэнарыі, не далі разгарэцца чарговай «каляровай рэвалюцыі».

Ужо ў суботу беларускія міратворцы вярнуліся ў Віцебск, дзе змаглі абняць сваіх родных.

Па словах кіраўніка краіны, міратворчая аперацыя да дэталяў была распрацавана прэзідэнтамі Расіі і Беларусі на працягу адной гадзіны. З задумы лідараў міністэрствы абароны дэталізавалі план, і ўжо праз некалькі гадзін вылецелі першыя самалёты ў Казахстан.

Як мяркуе Аляксандр Лукашэнка, патэнцыял міратворчых сіл АДКБ — процідзе ад «каляровых рэвалюцый».

«Поспех вашай місіі можна расцэньваць як з'яўленне эфектыўнага механізму барацьбы з так званымі «каляровымі рэвалюцыямі». Вядома, ваяваць супраць нас дорага, вельмі стратна, загінуць мільёны людзей. А вось знутры перавярнуць і дабіцца тых жа мэт — яны прафесіяналы», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік краіны канстатаваў, што міратворцы з гонарам выканалі задачы па забеспячэнні бяспекі найважнейшых дзяржаўных, ваенных аб'ектаў Казахстана, унеслі свой значны ўклад у стабілізацыю абстаноўкі ў краіне.

«Сёння на вас раўняюцца вайскоўцы Беларусі і Расіі. Вамі гаварацца сем'і і ўвесь беларускі народ. Вы прыпаднеслі нашым вайскоўцам выдатны ўрок паводзін у падобных сітуацыях», — дадаў ён.

Словы асаблівай падзякі ад Аляксандра Лукашэнкі і Міністэрству абароны Расійскай Федэрацыі, расійскім ваенным лётчыкам, якія арганізавалі і аператыўна забяспечылі дастаўку беларускага воінскага кантынгенту ў Казахстан і назад.

Дзяржаўнымі ўзнагародамі адзначаны некаторыя з байцоў. Але, як запэўніў кіраўнік краіны, усе ўдзельнікі спецаперацыі таксама будуць узнагароджаны. Гэта даручэнне атрымаў міністр абароны Віктар Хрэнін.

Прэзідэнт падзяліўся з ваеннымі: маліў Бога, каб усе байцы вярнуліся жывыя і здаровыя. «І я шчаслівы, што гэтая аперацыя завяршылася менавіта так. Сёння вы будзеце бачыць сваіх родных, свае сем'і, многія з вас абдымуць сваіх дзетак. Гэта самае вялікае шчасце для мяне як для галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі, калі ты пасылаеш, яшчэ раз падкрэслівае, сваіх дзяцей у нязведанае і яны вяртаюцца назад жывыя і здаровыя».

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, вяртанне кантынгенту ў поўным складзе асабліва значнае з факта таго, што за забойства беларускага і расійскага вайскоўца бандыты гатовы былі заплаціць тысячы долараў. «Але вы засталіся жывыя. Ды і нашы збеглыя, і тут яшчэ засталіся мярзотнікі, якія марылі, што нехта вернецца адтуль не ў такім стане. Не атрымалася. І за гэта я ўдзячны вам (за тое, што вы зберагліся сябе) і вашым камандзірам. Кожны дзень раніцай і ўвечары я проста дапытваў міністра абароны аб стане здароўя нашых вайскоўцаў. Вы выдатна зрабілі сваю працу, так, як і трэба нам, сапраўдным мужыкам. Вы выбралі такую прафесію, а час выбраў нас, і ад гэтага нікуды не падзецца», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Каментарый у тэму

У эфіры тэлеканала «Беларусь 1» **генеральны сакратар АДКБ Станіслаў ЗАСЬ** расказаў, што рашэнне аб уводзе міратворчых сіл у Казахстан прымалася вельмі хутка. «Літаральна 5 студзеня вечарам пачаліся кансультацыі на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў у тэлефонным рэжыме. Вельмі хутка быў дасягнуты кансэнсус. Усе падтрымалі зварот прэзідэнта Казахстана, таму рашэнне прымалася літаральна па гадзінах, — сказаў Станіслаў Зась. — Усе разумелі, што гэты зварот прэзідэнта краіны абгрунтаваны і адпавядае той сітуацыі, якая складаецца, стварылася для дзяржавы, і ўсе разумелі, што патрабуецца дапамога Казахстану».

Станіслаў Зась сцвярджае: прыход міратворцаў у Казахстан працвераззіў некаторыя гарачыя галовы і верагодна сарваў нейкія задумы, планы злачынцаў. «Гэта ацэнка тых людзей, хто працуе ў Казахстане. Таму прыбыццё міратворцаў садзейнічала пералому гэтай сітуацыі і стабілізацыі становішча», — сказаў ён.

Увесь кантынгент міратворчых сіл будзе выведзены з тэрыторыі Казахстана, і зроблена гэта будзе хутка, канстатаваў генсек арганізацыі. «Калі надвор'е не ўмяшаецца, то, згодна з планам Міністэрства абароны Расіі, да 19 студзеня ўключна спланавана ўсіх вярнуць у пункты пастаяннай дыслакацыі», — заявіў Станіслаў Зась.

«У НАС АТРЫМАЕЦЦА САПРАЎДЫ НАРОДНАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ»

Да абмеркавання праекта змяненняў і дапаўненняў Асноўнага Закона далучыліся педагагічныя работнікі сталіцы

За дыскусіяй у фармаце дыялогавай пляцоўкі дзякуючы анлайн-трансляцыі сачылі прадстаўнікі ўсіх устаноў агульнай сярэдняй, дашкольнай і дадатковай адукацыі Мінска.

Работнікі педагагічнай сферы аказаліся даволі цікаўнай і актыўнай аўдыторыяй. Дырэктары, настаўнікі задавалі экспертам нямала пытанняў, якія датычацца практычна ўсіх навацый, прапанаваных распрацоўшчыкамі новай рэдакцыі Асноўнага Закона нашай краіны. Узброеныя новымі ведамі, ужо яны панясуць гэтую інфармацыю ў масы — сутнасць канкрэтных палажэнняў Канстытуцыі педагагічныя супрацоўнікі будуць тлумачыць у сваіх калектывах, перад вучнямі і нават іх бацькамі. Усё дзеля таго, каб нашы суайчыннікі добра ўяўлялі, як будуць жыць у найбліжэйшыя 20, а можа, і больш гадоў.

«РЭФЕРЭНДУМАМ СПРАВА НЕ СКОНЧЫЦЦА»

— Кожны грамадзянін нашай краіны павінен ведаць і разумець яе Асноўны Закон, — пераканана **дырэктар гімназіі № 29 г. Мінска Георгій КУШНЯРОЎ**. — Тыя змяненні, якія сёння ўносяцца ў Канстытуцыю, датычацца кожнага, хто жыве ў Беларусі. Калі ў людзей ёсць сваё меркаванне, яго абавязкова неабходна выказаць: тое, што мае значэнне для ўсёй краіны, будзе ўключана ў Асноўны Закон. Важна, каб члены Канстытуцыйнай камісіі ўлічвалі ўсе прапановы, якія паступаюць ад грамадзян, тады ў нас атрымаецца сапраўды народная Канстытуцыя, якая будзе накіравана на сацыяльную абарону кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

Адказваючы на пытанні работнікаў педагагічнай сферы, **старшыня праўлення рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства «Веды» Вадзім ГІГІН** абвергнуў два найбольш папулярныя фэйкі, якія датычацца новай рэдакцыі Асноўнага Закона. Першы звязаны з тым, што Прэзідэнт нібыта распрацоўвае Канстытуцыю пад сябе. Другі, што законапраект з'яўляецца вынікам падзей 2020 года.

«Ні адно, ні другое — не праўда, — заўважыў вядомы палітолаг. — А дзеючая Канстытуцыя тады была пад каго?! Апаненты ўлады ўжо столькі раз абвінавачвалі гэтую Канстытуцыю ў тым, што яна суперпрэзідэнцкая, а тут раптам яшчэ нейкая іншая. Прэзідэнт упершыню загаварыў аб змяненнях у Канстытуцыі ў кастрычніку 2016 года, адкрываючы першае пасяджэнне сесіі Парламента. У 2016 годзе, здавалася, ніякіх змяненняў не павінна было быць. У 2021-м, калі мы з вамі на Усебеларускім народным сходзе ўносілі ў рэзалюцыю неабходнасць змяненняў, вызначалі тэрмін рэферэндуму, наадварот, людзі казалі, што яны за гэтага Прэзідэнта змагаліся: маўляў, яны не хочуць ніякіх змяненняў. Аднак Прэзідэнт узяў на сябе гэтую адказнасць, бо палітык адказны перш за ўсё, ён разумее, што трэба глядзець у будучыню. Гэта Канстытуцыя будучыні, Канстытуцыя, якая закладвае пэўныя параметры абноўленай палітычнай сістэмы. І рэферэндумам справа не скончыцца. Нам яшчэ трэба будзе прыняць канстытуцыйныя законы, законы аб Усебеларускім народным сходзе, палітычных партыях, грамадскіх аб'яднаннях, грамадзянскай супольнасці, асновах маладзёжнай палітыкі і шэраг іншых. Правесці выбары ў адзіны дзень галасавання (у апошнюю нядзелю лютага), затым прэзідэнцкія — і тады гэтая трансфармацыя будзе завершана».

НЕБЫВАЛЫ ГРАМАДСКІ ЎЗДЫМ

Як расказалі эксперты, у Канстытуцыйную камісію ўжо паступіла звыш сямі тысяч зваротаў. На першым месцы стаяць пытанні па дзейнасці Усебеларускага народнага сходу. Затым людзей найбольш хвалююць сацыяльныя гарантыі, у прыватнасці, 45 артыкул, які датычыцца пытання аховы здароўя.

— Акрамя таго, нашы людзі вельмі чулліва адносяцца да абмежавання ўлады Прэзідэнта, — звярнуў увагу Вадзім Гігін. — Прычым на гэты конт такія баталіі разгортваюцца: чаму два тэрміны, чаму Прэзідэнт не будзе выдаваць дэкрэты, чаму ўказ не будзе роўны закону? А ведаеце, чаму так адбываецца? Мы з вамі ў барацьбе загартаваліся, і Прэзідэнт стаў для нас сімвалам барацьбы за нашу Беларусь. Сапраўды, як ніколі, сёння ён увасабляе суверэнітэт і незалежнасць.

Па словах кіраўніка таварыства «Веды», важна тое, што не ідзе абмеркаванне, патрэбная нам Канстытуцыя ці не. «Гэты неверагодны грамадскі ўздым, які мы перажываем, калі людзі звяртаюць увагу на асобныя артыкулы, нават асобныя пункты, патрабуюць, перадаюць свае прапановы, супераджываюць гэтаму працэсу, сведчыць аб тым, што наша грамадства сапраўды сталае, — падкрэсліў Вадзім Гігін. — Сфарміравалася грамадзянская супольнасць, у нас цяпер высокая ступень грамадзянскай мабілізацыі. Мы разняволілі нашу грамадскую ініцыятыву, патрыятычныя сілы і дасягнулі гэтага ў тым ліку дзякуючы жніўню 2020 года. Мы цяпер мацнейшыя, чым былі 8 жніўня. У ходзе абмеркавання і прыняцця Канстытуцыі рэферэндумам мы гэты пад'ём не павінны страціць. Мы павінны яшчэ больш узмацніцца — і падчас абмеркавання мы гэта бачым».

«ГІСТОРЫЯ — АСНОВА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ»

Як вядома, гэты год аб'яўлены Годам гістарычнай памяці. У 15 артыкул Канстытуцыі ўнесены дапаўненні аб тым, што «дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны». Педагогаў цікавіла, чаму сёння ўзнікла неабходнасць заканадаўчага замацавання перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ў Асноўным Законе краіны?

— Гэта адбываецца не толькі з-за таго, што ад нас сыходзяць ветэраны, а і, на жаль, з той прычыны, што нашы суседзі праводзяць агрэсіўную палітыку ў адносінах менавіта да гэтай падзеі, — адказваючы на пытанне, удакладніў Вадзім Гігін. — Мы вымушаныя сутыкацца з гэтымі выклікамі. Гэты грамадскі ўздым, пачынаючы са жніўня 2020 года, як ніколі раней, суправаджаўся і зваротам да гісторыі. Мы сталі разумець, што гісторыя — гэта вельмі важны складнік, аснова нацыянальнай ідэі. Мы часам спрабавалі балансаваць, лавіраваць, ісці на кампраміс. Цяпер жа трэба даваць адпор нашым праціўнікам. Мы не будзем ствараць гістарычную паліцыю, як робяць некаторыя краіны, аднак мы абвяшчаем у Канстытуцыі, што памяць аб Вялікай Айчыннай вайне непарушная.

Адказваючы на пытанне, як павінна быць выбудавана работа па патрыятычным выхаванні ў сучасных умовах, **старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір КУХАРАЎ** адзначыў, што не трэба падыходзіць да гэтага з карэннымі пераломамі. «У нас багаты вопыт з савецкіх часоў, і не трэба ад гэтага адмаўляцца, — лічыць старшыня Мінгарвыканкама. — Калі мы не будзем расказваць дзецям і ўнукам, што яны — грамадзяне краіны, якая многае перанесла, то за нас гэта ніхто не зробіць. Моладзь упусціць нельга. Гэта наша будучыня».

УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД: ТЭНДЭНЦЫІ І КАМПЕТЭНЦЫІ

Адно з ключавых новаўвядзенняў у Асноўным Законе — узмацненне народаўладдзя ў выглядзе Усебеларускага народнага сходу. На думку Уладзіміра Кухарава, у найскладанейшыя моманты, якія былі ў нашай краіне, менавіта Усебеларускі народны сход выконваў важную, стабілізуючую ролю. «З улікам вопыту нашай дзяржаўнасці, мы бачым, што Усебеларускі народны сход — стабілізуючы орган, які дасканала разбярэцца ў любых праблемах, — заявіў старшыня Мінгарвыканкама. — Тыя прапановы па гэтым пытанні, унесеныя ў праект Канстытуцыі, накіраванныя на тое, каб у нас у краіне быў народны орган. Уносіцца прапанова надзяліць яго шырокімі паўнамоцтвамі, і мы павінны дасканала абмеркаваць гэтыя паўнамоцтвы. Канкрэтных прапаноў будзе шмат. Яны будуць абавязкова прааналізаваныя, каб мы стварылі ў краіне канстытуцыйны орган, які ў вырашальныя моманты скажа сваё важкае слова для таго, каб краіна заставалася стабільнай, суверэннай і незалежнай».

— Усебеларускі народны сход стане і органам кантролю за ўладай, — удакладніў Вадзім Гігін. — Пакуль тэндэнцыя такая, што Усебеларускі народны сход сістэму нашу ўзмоцніць: за кошт больш шырокага народнага прадстаўніцтва, больш гучнага голасу рэгіёнаў, дэпутацкага корпуса. Будзе зроблена ўсё для таго, каб сход працаваў ва ўмовах магчымых надзвычайных сітуацый. Мы бачым, якая абстаноўка ў свеце. Свет стаіць на мяжы вайны.

«На такіх дыялогавых пляцоўках мы бачым непадробленую цікавасць да новай версіі Канстытуцыі, і вельмі радуе, што вялікая колькасць людзей фактычна акунулася ў гэтае абмеркаванне, — рэзюмаваў старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў. — Гэта сведчыць аб тым, што іх цікавіць лёс краіны. Усе разумеюць, што Канстытуцыя — гэта Асноўны Закон нашай дзяржавы, і ён ствараецца не на кароткі перыяд. Гэта доўгатэрміновы дакумент, які ахоплівае ўсе сферы дзейнасці. Жыццё мяняецца, яго тэмп вельмі высокі. Мы бачым, што сёння ўзнікла неабходнасць па-новаму зірнуць і сувымераць тыя падыходы, якія былі закладзены ў дзеючую Канстытуцыю, і пераламіць іх, выходзячы з той рэчаіснасці, якая сёння гэты працэс ахоплівае. Працэс адкрыты, усе прапановы аналізуюцца. Для таго і праводзіцца абмеркаванне, каб новы законапраект задавальняў усе пласты грамадства».

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА.

ДАСЛОЎНА

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, Старшыня Палаты прадстаўнікоў, пасля сустрэчы з работнікамі ААТ «Полацк-Шкловалакно»:

«Абмеркаванне змяненняў у Асноўны Закон ідзе вельмі актыўна. Мы нават не чакалі такой высокай зацікаўленасці. Людзі не толькі выслухоўваюць тыя змяненні і дапаўненні, якія ўносяцца, але і выказваюць свой пункт гледжання, што можа быць упушчана. Калі падводзіць вынік маіх сустрэч у калектывах, то людзі найбольш непакояцца за тое, каб была захавана беларуская мадэль дзяржаўнасці, не было карэннай ломкі, каб сацыяльная накіраванасць развіцця Беларусі заставалася нязменнай у Канстытуцыі. Канешне, тут няма нейкага спажывецкага стаўлення, таму што беларусы падтрымліваюць, што кожны грамадзянін павінен уносіць пасільны ўклад у развіццё краіны.

Яшчэ сярод хвалюючых тэм — захаванне гістарычнай памяці і праўды. Такая пазіцыя таксама знаходзіць пазітыўны водгук у людзей. Гэта гучала на сустрэчах на полацкай зямлі, таму што тут быў моцна развіты партызанскі рух у гады Вялікай Айчыннай вайны, памятаецца Асвейская трагедыя. Адсюль пачыналася і беларуская дзяржаўнасць, таму людзі гавораць аб тым, што трэба не толькі дэкларацыі, але, можа, і запісаць у Канстытуцыі, што кожны беларус павінен ведаць, шанаваць і аберагаць гісторыю. Мы маем багатую культурную і гістарычную спадчыну, якая павінна працаваць на развіццё краіны і кансалідацыю грамадства».

Калі ў вас з'явіцца меркаванні з нагоды праекта — пішыце ў рэдакцыю або непасрэдна ў арганізацыю, якая будзе акумуляваць і аналізаваць усе заўвагі і прапановы, — Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі. Можна скарыстацца электроннай поштай sbor@ncpi.gov.by; можна запоўніць электронную форму, якая маецца на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале па адрасе: https://sbor.pravo.by; можна даслаць па пошце на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Берсана, 1А, НЦПІ, з пазнакай «Канстытуцыя».

Юрый СЯНЬКО:

«БЕЛАРУСЬ І КІТАЙ ДАСЯГНУЛІ ВЫДАТНЫХ ВЫНІКАЎ»

Кітай займае выключнае месца ў знешняй палітыцы Беларусі, гэта наш асноўны стратэгічны партнёр у азіяцкім рэгіёне. Мінулы год стаў на самай справе знакавым у прадукцыйным фармаце беларуска-кітайскага супрацоўніцтва, якое дынамічна развіваецца на працягу трох дзесяцігоддзяў. Дыпламатычныя адносіны паміж краінамі былі ўстаноўлены 20 студзеня 1992-га. Напярэдадні адметнай даты на пытанні «Звязды» адказаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў КНР Юрый СЯНЬКО.

Фота БелТА.

— Юрый Аляксеевіч, у чым, на ваш погляд, унікальнасць гістарычнай даты — 30-й гадавіны ўсталявання дыпламатычных адносін Беларусі і Кітая?

— На мой погляд, унікальнасць адносін Беларусі і Кітая ў тым, што за невялікі па мерках гісторыі перыяд у 30 гадоў нашы краіны дасягнулі насмрэч выдатных вынікаў, а ў некаторых момантах — і немагчымых. Прыняты толькі некалькі прыкладаў. Узровень двухбаковага супрацоўніцтва вырас ад узаемадзеяння па ключавых пытаннях да «адносін давернага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва». Больш за тое, сёння мы ўжо паслядоўна рухаемся да гістарычнага павышэння ўзроўню нашых адносін з Кітаем да «жалезнага братэрства» і «ўсёпагоднага партнёрства». Нараўне з пасольствамі ў дзвюх краінах у Кітаі дзейнічаюць ужо тры беларускія генеральныя консульствы ў Шанхаі, Гуанчжоу і Чунцыне, і літаральна напярэдадні Новага года падпісана пагадненне аб адкрыцці чацвёртага — у спецыяльным адміністрацыйным раёне Сянган (Ганконг).

Пачынаючы з 1992-га, тавараабарот з Кітаем вырас больш як у 130 разоў. Беларусь стала адным з ключавых удзельнікаў ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях». Актыўна развіваецца міжнародны праект Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень», дзе ўжо 85 рэзідэнтаў з 15 краін свету, у тым ліку 43 кампаніі з кітайскім капіталам. Толькі за мінулы год у парку былі зарэгістраваны 20 новых рэзідэнтаў. Транзітам праз нашу краіну праходзіць больш за 80 працэнтаў усіх таварных цягнікоў па маршруце Кітай — Еўропа — Кітай. І гэта далёка не поўны спіс нашых агульных дасягненняў.

— Супрацоўніцтва нашых краін носіць стратэгічны характар, якое вызначаецца як «жалезнае братэрства» і «ўсёпагоднае партнёрства». Дзякуючы чаму ўдалося дасягнуць такога высокага ўзроўню ўзаемадзеяння? Якімі канкрэтнымі вынікамі гэта пацвярджаецца?

— Я глыбока перакананы, што бягучы ўзровень узаемадзеяння дзвюх краін дасягнуты ў многім дзякуючы асабістай увазе нашых лідараў — Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Старшыні КНР Сі Цзіньпіна. Разам з тым такі ўзровень супрацоўніцтва, безумоўна, дасягнуты за кошт самаадданай, ініцыятыўнай работы беларускіх і кітайскіх спецыялістаў дзяржаўных устаноў і прадпрыемстваў, якія на розных этапах уносілі і ўносяць свой бясцэнны ўклад ва ўмацаванне кантактаў паміж нашымі краінамі.

— Вы ахарактарызавалі Дырэктыву Прэзідэнта № 9 як комплексны дакумент, у якім сабраны прарыўныя напрамкі двухбаковага ўзаемадзеяння. Якія асноўныя пункты росту?

— Напярэдадні святкавання 30-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Кітаем Прэзідэнт нашай краіны падпісаў Дырэктыву № 9 аб развіцці адносін з КНР, тым самым падкрэсліўшы значэнне, якое сёння надаецца беларускім кіраўніцтвам супрацоўніцтву з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Рэалізаваўшы яго, мы выведзем нашы адносіны на якасна новы гістарычны ўзровень.

На жаль, бягучая сусветная сітуацыя вельмі далёкая ад ідэальнай. Асобныя краіны свету развучыліся чуць адна адну, пагражаючы чалавецтву незваротнымі наступствамі. На гэтым фоне выгадна адрозніваецца ўзаемадзеянне Беларусі і Кітая. За 30 гадоў дыпламатычных адносін Рэспубліка Беларусь ні на крок не адступіла ад узятых на сябе абавязацельстваў у адносінах да Кітайскай Народнай Рэспублікі, у тым ліку ў пытаннях тэрытарыяльнай цэласнасці. Мы паслядоўна выбудоўваем адносіны са сваім стратэгічным партнёрам. Сёння можна з упэўненасцю сказаць, што наша супрацоўніцтва прайшло ўсе выпрабаванні часам і з'яўляецца сапраўды ўзорам узаемаадносін паміж дзяржавамі.

У эканоміцы драйверам беларускага экспарту ў Кітай на найбліжэйшы час выступіць, у першую чаргу, харчовая і сельгаспрадукцыя, якая прадаўжае прырастаць тэмпамі больш як 30 працэнтаў. Па кітайскіх стандартах ужо акрэдытавана больш за 120 беларускіх прадпрыемстваў. Апроч згаданага аграпрамысловага сектара, будзем нарошчваць экспарт прадукцыі калійнай галіны, дрэваапрацоўкі, лёгкай прамысловасці. Мы стабільна ўваходзім у тройку галоўных пастаўшчыкоў у Кітай калійных угнаенняў. Таксама ў топавых пазіцыях нашага экспарту ў КНР знаходзяцца электронныя інтэгральныя схемы, цэлюлоза, лён, рапсавы алей.

Беларускі экспарт у Кітай стаў дыверсіфікаваным і ўжо не прывязаны да манапазіцый, як раней, калі калійныя ўгнаенні складалі больш за 2/3 у аб'ёмах. Цяпер на долю харчовай і сельгаспрадукцыі прыпадае больш за 40 працэнтаў таварнага экспарту, што перавышае адпаведную долю калійных угнаенняў пры стабільным росце абедзвюх таварных груп. Акрамя таго, мы ставім перад сабой задачу якаснага напаўнення экспарту і павышэння долі прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю. Тут перспектывы ёсць і ў кандытарскіх вырабаў, мясных, рыбных кансерваў, алкагольнай і безалкагольнай прадукцыі, бакалеі, снэкаў, лёгкай прамысловасці і г. д. Дырэктывай № 9 прадугледжана стварэнне новых суб'-ектаў тавараправаднай сеткі і адпаведнай інфраструктуры, што, безумоўна, будзе садзейнічаць далейшаму нарошчванню паставак у Кітай.

Наш ключавы стратэгічны і самы маштабны сумесны праект — Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». У найбліжэйшай будучыні разлічваем на прыход «якарных» інвестараў з КНР з высокатэхналагічнымі інавацыйнымі праектамі, для гэтага ў парку створаны максімальна спрыяльныя камфортныя ўмовы вядзення бізнесу. Згодна з Дырэктывай № 9, у 2025 годзе рэзідэнтаў павінна стаць не менш за 170. Праз ажыццяўленне прадугледжаных у дакументе мер, уключаючы стварэнне рэгіянальнага цэнтра традыцыйнай і інавацыйнай кітайскай медыцыны, укараненне тэхналогій 5G, венчурнага фінансавання і падтрымку стартапаў, рэалізацыю міжнароднага лагістычнага праекта «Еўразійскі чыгуначны гейтвэй» і іншых ініцыятыў, мы зможам атрымаць неабходны эфект ад «Вялікага каменя» ў выглядзе адпаведнага прыросту ВУП, нарошчвання аб'ёмаў знешняга гандлю, а таксама сацыяльных выгод для насельніцтва.

— Адзін з драйвераў — міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. Аб гэтым ідзе размова ў Дырэктыве № 9, аб'яўлены Год рэгіёнаў Беларусі і Кітая. Чаму гэтаму напрамку адводзіцца стратэгічная роля?

— Міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву не ўпершыню адводзіцца важная роля ў развіцці ўсяго комплексу беларуска-кітайскіх адносін. Так, у маі 2015 года пры асабістым удзеле Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Старшыні КНР Сі Цзіньпіна ў Мінску адбыўся Беларуска-Кітайскі міжрэгіянальны бізнес-форум, які надаў значны імпульс развіццю сувязяў паміж рэгіёнамі нашых краін. Па рашэнні кіраўнікоў дзяржаў 2021—2022 гады былі аб'яўлены гадамі рэгіёнаў Беларусі і Кітая.

Зараз усе 6 беларускіх абласцей і г. Мінск устанавілі пабрацімскія адносіны з дзвюма і больш правінцыямі Кітая і актыўна развіваюць двухбаковае ўзаемадзеянне па розных напрамках. Так, толькі за мінулы год нашымі абласцямі з кітайскімі пабрацімамі былі падпісаны 4 пагадненні аб комплексным паглыбленні і пашырэнні супрацоўніцтва.

У Дырэктыве № 9 прадугледжаны механізмы планамернага пераходу ад колькаснага напаўнення міжрэгіянальнага супрацоўніцтва да якаснага. У першую чаргу, у эканамічнай і гуманітарнай сферах. Перакананы, што такое ўзаемадзеянне забяспечыць стратэгічнае паглыбленне і пашырэнне гандлёва-эканамічных, інвестыцыйных, культурных, турыстычных і іншых сувязяў паміж нашымі краінамі.

Прыняты некалькі лічбаў. Магілёўская вобласць — пабрацім Цяньцзіня, правінцый Шэньсі, Цзянсу, Хунань і Хэнань — рэгіёнаў КНР з сукупным насельніцтвам больш як 230 млн чалавек і ВУП больш як 1,8 трлн доларaў ЗША. У Брэсцкай вобласці ўстаноўлены партнёрскія адносіны з рэгіёнамі насельніцтвам больш як 200 млн чалавек і ВУП больш як 1,4 трлн доларaў. Усё гэта патэнцыяльныя рынкі для нашага экспарту.

Па ініцыятыве Пасольства Беларусі ў КНР у мінулым годзе ў Пекіне і правінцыях Кітая праведзена 17 прэзентацый прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў, у тым ліку ААТ «Камунарка», ТАА «Мінск Крышталь», ААТ «Гомельскі тлушчавы камбінат», ААТ «Чырвоны Харчавік», ААТ «Крыніца», ААТ «Брэсцкае піва», ААТ «Лідахарчканцэнтраты», ААТ «Ляхавіцкі кансервавы завод», ААТ «Радамір», ААТ «Рагачоўскі МКК», ААТ «Слодыч», ААТ «Спартак», ААТ «Слуцкі цукрарафінадны камбінат», ААТ «Віцьба» і інш. Адзначу, што мерапрыемствы па прэзентацыі беларускай прадукцыі наведала больш за 40 кітайскіх кампаній, у тым ліку найбуйнейшыя імпарцёры КНР — КОФКА, ГРЫНЛЭНД, ЧАЙНА МЕРЧАНТС ГРУП, CITIK, Асацыяцыя буйных гандлёвых сетак КНР і інш.

Мы ўпэўнены, што міжрэгіянальнае супрацоўніцтва — лакаматыў двухбаковых адносін Беларусі і Кітая, і ў нас ёсць вялікі патэнцыял для далейшай рэалізацыі сумесных праектаў і ініцыятыў.

— Беларусь актыўна ўдзельнічае ў рэалізацыі аднаго з галоўных транснацыянальных праектаў сучаснасці, ініцыіраваных Кітаем, — «Адзін пояс, адзін шлях». Індустрыяльны парк «Вялікі камень» па праве называюць жамчужынай Шаўковага шляху. За кошт чаго, на ваш погляд, нашай краіне ўдалося стаць ключавым транспартным і лагістычным хабам на маршруце Кітай — Еўропа — Кітай?

— Беларусь першай з еўрапейскіх краін афіцыйна падтрымала і далучылася да ініцыятывы Кітая «Пояс і шлях». Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка па асабістым запрашэнні Старшыні Кітая Сі Цзіньпіна ўдзельнічаў у абодвух міжнародных самітах, прысвечаных «Поясу і шляху», у Пекіне ў маі 2017-га і красавіку 2019-га, дзе выступіў з канструктыўнымі прапановамі па развіцці ініцыятывы.

Наша краіна па праве вызначана апорнай пляцоўкай «Пояса і шляху» ў еўразійскім рэгіёне. Гэтаму садзейнічае выгаднае геаграфічнае становішча Беларусі па маршруце Эканамічнага пояса Шаўковага шляху, які даказаў сваю эфектыўнасць, падтрымліваючы работу ланцужкоў паставак падчас пандэміі. Беларускі ўчастак сухапутнага маршруту «Пояса і шляху» — вельмі важны элемент чыгуначнай транспартнай магістралі Кітай — Еўропа. Беларусі адводзіцца роля вузлавой платформы на шляху транспартнага калідора. Праз нашу краіну праходзіць асноўны паток сухапутнага кітайскага экспарту, тут абслугоўваюцца і фарміруюцца саставы, якія далей ідуць у краіны Еўрасаюза. Цяпер кантэйнерныя цягнікі звязваюць 60 гарадоў Кітая са 170 гарадамі 23 краін Еўропы. У сярэднім у суткі па Беларускай чыгунцы забяспечваюцца транзітныя зносіны і тэрміналная апрацоўка каля 25 кантэйнерных цягнікоў па маршруце Кітай — Еўропа — Кітай. Паводле ацэнак Беларускай чыгункі, аб'ём транзітных кантэйнерных перавозак у мінулым годзе павялічыўся на 29 % і склаў каля 930 тысяч кантэйнераў, у тым ліку ў паведамленні Кітай — Еўропа — Кітай ён узрос у 1,3 раза. З улікам вялікага патэнцыялу кітайскага рынку можна прагназаваць далейшы рост аб'ёмаў перавозак.

Асобнай увагі заслугоўвае пачатак рэалізацыі праекта міжнароднага лагістычнага тэрмінала «Еўразійскі чыгуначны гейтвэй» у парку «Вялікі камень». Гэта міжнародны праект, у ім ужо ўдзельнічаюць кампаніі з Кітая, Германіі, Беларусі і Швейцарыі. Разлічваем, што яго паспяховая рэалізацыя значна сэканоміць час у дарозе і павысіць хуткасць апрацоўкі грузаў, а значыць, павялічыць прапускную здольнасць вельмі папулярнага маршруту Кітай — Еўропа — Кітай.

— Пандэмія каранавіруса ўнесла кардынальныя карэктывы ў развіццё краін па ўсім свеце. Як адбіўся гэты фактар на беларуска-кітайскім супрацоўніцтве?

— Безумоўна, пандэмія аказала ўплыў на развіццё беларуска-кітайскага супрацоўніцтва. Інакш і быць не магло. Найбольш моцна пацярпела сфера турызму. У новых умовах нам было неабходна хутка знайсці новыя формы камунікацый і ўзаемадзеяння, падстроіцца пад новыя рэаліі. Што яшчэ важна — з новых бакоў адкрылася сяброўства беларусаў і кітайцаў. Калі пачалася пандэмія, мы абсалютна шчыра падтрымлівалі адзін аднаго ў гэтай бядзе, аказваючы не толькі медыцынскую гуманітарную дапамогу, але і простымі, але такімі патрэбнымі ў той час, ды і зараз словамі падтрымкі.

Сапраўды, пандэмія каранавіруса COVID-19 аказала і працягвае аказваць істотны ўплыў на сусветную эканоміку і кожную краіну. Кітай першым сутыкнуўся з невядомай інфекцыяй, былі закрыты цэлыя гарады, каб пазбегнуць яе распаўсюджвання. Тое, як КНР удалося шляхам прыняцця беспрэцэдэнтных мер узяць пад кантроль успышку інфекцыі, заслугоўвае павагі.

У ходзе супрацьстаяння гэтым новым выклікам адносіны Беларусі і Кітая паказалі сябе як узорныя. Нягледзячы на цяжкасці і нязручнасці каранцінных абмежаванняў, у нас падтрымліваюцца кантакты на ўсіх узроўнях, і эфектыўнасць беларуска-кітайскага супрацоўніцтва застаецца высокай. Гэта пацвярджае і станоўчая дынаміка экспарту беларускай прадукцыі ў Кітай, які па выніках 2020 года вырас на 9,4 працэнта, а за 11 месяцаў 2021-га — на 14,2 працэнта. Значна павялічваецца аб'ём чыгуначных перавозак па маршруце Кітай — Еўропа — Кітай, які праходзіць праз нашу краіну.

Такім чынам, пандэмія каранавіруса — гэта як праверка на трывалась адносін паміж нашымі краінамі. І мы з Кітаем яе паспяхова прайшлі.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Моцныя рэгіёнамі

РАДЗІМА НА ЛОЕЎСКІХ БЕРАГАХ

На якія пытанні адказвае Год гістарычнай памяці і як у глыбінцы падыходзяць да захавання спадчыны продкаў? Пра гэта і не толькі — наша гутарка з кіраўніком аднаго з самых маляўнічых рэгіёнаў поўдня Беларусі — старшынёй Лоеўскага райвыканкама Веранікай БАЙКОВАЙ.

— Лоеўшчына — прыклад самабытнага краю, якому ўдаецца чэрпаць сілы для свайго развіцця, у тым ліку ў плане гістарычнай памяці. Як адчуваюць тое ў самім раёне?

— У снежні мінулага года Лоеўскі раён адзначыў 95-годдзе. Сёння тут жыве звыш 11 з паловай тысячы чалавек, а ў часы Вялікай Айчыннай вайны за яго аддалю жыцці амаль 12 тысяч воінаў розных нацыянальнасцяў. За баі па вызваленні магутнага абарончага рубяжа фашыстаў на гэтым беразе Дняпра 365 савецкіх воінаў атрымалі званне Героя Савецкага Саюза. Сэрца замірае, калі суадносіш гэтыя лічбы. І сучаснасць, і будучыня нашага раёна немагчымыя без гістарычнай памяці, якая з году ў год працягвае аб'ядноўваць усіх лаяўчан. Усіх, хто лічыць Лоеў сваёй радзімай, хто прыехаў сюды аднойчы, каб застацца тут назаўжды, хто пакінуў Лоеў, але верны гораду душой і сэрцам, хто шануе памяць продкаў, паважае працу тых, хто кожны дзень робіць родны край лепшым.

— Больш як тры дзясяткі гадоў таму імкненне да захавання ваеннай памяці на доўгія гады вызначыла далейшае развіццё Лоеўшчыны — культурнай, патрыятычнай...

— Так, 9 мая 1985 года па рашэнні кіраўніцтва Беларусі да юбілейнага Дня Перамогі ў Лоеве быў заснаваны маштабны мемарыяльны комплекс: экспазіцыя музея, адкрытая пляцоўка баявой тэхнікі і сродкаў пераправы ваеннага часу, бліндаж каманднага пункта арміі. Узведзены памятны абеліск, уладкавана Алея Герояў, добраўпарадкавана брацкае пахаванне звыш пяцісот воінаў, якія загінулі пры фарсіраванні Дняпра. Праект мемарыяльнага комплексу распрацоўваўся навуковымі супрацоўнікамі будучага Лоеўскага музея сумесна з рэстаўратарамі і мастакамі сталічнага музея гісторыі вайны. У райцэнтры вяліся маштабныя будаўнічыя работы, адбыліся кардынальныя змены ў гістарычным цэнтры населенага пункта. Так у Лоеве быў адкрыты філіял Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — Музей бітвы за Дняпро. Можна смела сцвярджаць, што з'яўленне мемарыяльнага комплексу вызначыла не толькі культурны вектар развіцця ўсяго раёна, але таксама і развіццё гарадскога асяроддзя. Менавіта музей і пляцоўка баявой тэхнікі сфарміравалі сучаснае ўяўленне аб гарадскім цэнтры Лоева, яны сталі візітнай карткай раёна.

— Музей бітвы за Дняпро — адзіная прафесійная музейная ўстанова ў раёне. Пры гэтым менавіта Лоеўшчына вылучаецца асаблівым падыходам да вядзення музейнай справы на самым высокім узроўні...

— Сёння Музей бітвы за Дняпро — навукова-даследчая і асветніцкая ўстанова, лакальны цэнтр музейнай справы, метадычнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці. Маючы гістарычны профіль і даволі вузкую тэму экспазіцыі — фарсіраванне Дняпра і вызваленне Лоеўскага раёна, — супрацоўнікі музея імкнуцца ахапіць і іншыя гістарычныя падзеі, факты і культурныя з'явы, звязаныя з нашым рэгіёнам. Акрамя пастаяннай экспазіцыі, супрацоўнікі рыхтуюць для наведвальнікаў у сярэднім да двух дзясяткаў выставачных праектаў за год. У музеі з 2019 года функцыянуе Цэнтр дакументацыі культурнай спадчыны. Тут размешчаны інтэрактыўныя карты лакацый, дзе сродкамі музейнай інтэрпрэтацыі перададзены матэрыяльныя аб'екты і нематэрыяльныя элементы культурнай спадчыны раёна. Лоеўскія музейшчыкі развіваюць інавацыйную дзейнасць, акумулююць і публікуюць цікавыя навуковыя даследаванні, прыцягваюць да ўключэння ў даследчыцкую справу жыхароў раёна, моладзь, школьнікаў.

— Ведаю, што захаванне ваеннай гісторыі на Лоеўшчыне прыцягвае і міжнародны інтарэс.

— Так, шмат гераічных падзей, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной, адбылося на лоеўскай зямлі. На шчасце, яшчэ жывыя іх удзельнікі і відавочцы, якія дзеляцца з намі ўспамінамі. За брацкімі пахаваннямі сваіх продкаў даглядаюць унукі і праўнукі загінулых герояў. Аддаць даніну памяці і пакланіцца магілам землякоў, якія загінулі ў гады вайны на тэрыторыі Беларусі, прыязджаюць і госці з іншых краін. З году ў год Лоеўскі раён наведваюць дэлегацыі з Рэспублік Саха (Якуція) і Башкартастан Расійскай Федэрацыі і Узбекістана. Прыязджаюць прадстаўнікі ветэранскіх арганізацый, педагогі і школьнікі, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі. Для гасцей праводзім экскурсіі па мемарыяльным комплексе «Бітва за Дняпро» з наведваннем музея. Ваеннаслужачыя пагранічнай камендатуры «Лоеў» праводзяць парад плаўсродкаў, бяруць удзел у кранальнай цырымоніі ўскладання вянка на ваду ў памяць аб загінулых героях. Падчас наведвання госці прызнаюцца: для іх добрая сімвалічная традыцыя — пераадолець тысячы кіламетраў, каб аддаць даніну памяці герояў Вялікай Айчыннай вайны. Так, дэлегацыі якутаў з году ў год прыязджаюць на Лоеўшчыну, каб пакланіцца магіле свайго земляка — Героя Савецкага Саюза Фёдара Кузьміча Папова ў вёсцы Дзеражычы. Каля воінскіх пахаванняў у вёсках Дзеражычы і Хамінка традыцыйна праходзяць мітынгі памяці Герояў Савецкага Саюза Абдусаліма Дэхканбаева і Джурахана Усманава. Гвардыі лейтэнант Джурахан Усманаў навечна залічаны ў спісы вайсковай часці. Пахаваны герой у родным кішлаку Сават Хавацкага раёна Сырдар'інскай вобласці (Узбекістан), а далёкая лоеўская вёска Хамінка з падзякай шануе ў назве вуліцы памяць воіна, які вызваляў наш раён, праявіўшы пры гэтым вялікі гераізм. І ўсе госці міжнацыянальных дэлегацый не перастаюць шчыра дзякаваць за тое, што беларусы могуць бярэзліва і ўважліва ставіцца да тых, хто абараніў мір і свабоду. Увогуле, такія міжкультурныя, міжнацыянальныя сувязі асабліва ў пытаннях захавання ваеннай гістарычнай памяці, вельмі важныя для нашага раёна. Безумоўна, мы імкнёмся іх развіваць, абуджаць інтарэс да традыцый ушанавання герояў у нашага маладога пакалення.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Добрая навіна

«КІТ» У МІХАНАВІЧАХ

Усіх ахвотных запрашае шматфункцыянальны спартыўны аб'ект

У аграгарадку Міханавічы Мінскага раёна адкрылі сучасны шматфункцыянальны фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Кіт».

Гэта добры падарунак жыхарам пасёлка, дзе налічваецца больш як 10 тысяч чалавек. На тэрыторыі сельсавета размешчаны 15 населеных пунктаў, у тым ліку два аграгарадкі, больш за 100 устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый розных формаў уласнасці, школы, дзіцячыя садкі, аддзяленне дзённага пражывання для інвалідаў і грамадзян пажылога ўзросту. Яны таксама змогуць наведваць ФАК, дзе будуць праходзіць рэабілітацыю. У комплексе створана безбар'ернае асяроддзе для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.



Фота БелТА

Плавальны басейн у фізкультурна-аздараўленчым комплексе.

— Гэты знакавы аб'ект мы пабудавалі разам з адкрытым акцыянерным таварыствам «Газпрам трансгаз Беларусь». І я ўдзячны яго генеральнаму дырэктару Уладзіміру Маёраву за супрацоўніцтва, — адзначыў падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця **старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.** — У аграгарадку жыве шмат газавікоў, абслуговага персаналу, якія працуюць на гэтым прадпрыемстве. Цяпер у іх з'явілася магчымасць пасля напружанай работы добра адпачыць. Комплекс у Міханавічах — пачатак рэалізацыі такіх сумесных праектаў у вобласці. Сёння падпісана пагадненне з Крупскім раёнам. Мяркую, сёлета зробім праектаванне, магчыма, пачнём там будаўніцтва спартыўнага аб'екта і завершым яго ўзвядзенне ў 2023-м.

У наступныя гады, па словах Аляксандра Турчына, плануецца значную ўвагу ўдзяляць развіццю сацыяльна-транспартнай інфраструктуры ў Мінскім раёне. Тут размешчаны буйныя населеныя пункты: Бараўляны, Калодзішчы, Мачулішчы, Гатава, Лугавая Слабада і іншыя. Аднак інфраструктура не адпавядае патрабаванням, якія аб'ектыўна выказваюць людзі. Для паляпшэння якасці дарог у Мінскім раёне прадугледжаны дадатковыя фінансавыя рэсурсы з абласнога бюджэту. Вядома, навядзенне парадку патрабуе значных затрат. Тым не менш, як бы складана ні было, вобласць, рэгіёны будуць укладваць сродкі ў аб'екты, якія паляпшаюць якасць жыцця людзей, уплываюць на іх здароўе, настрой.

Вядома, за папярэднія гады ў раёне зроблена нямала, з'явілася новыя дзіцячыя садкі, школы, установы аховы здароўя, будаўніцтва якіх працягнецца і ў далейшым. Сёлета яны таксама будуць уводзіцца ў дзеянне. У планах на 2022-і — больш маштабна падысці да Мачулішчаў, дзе яшчэ шмат праблем. У прыватнасці, неабходна ўладкаваць там дваровыя тэрыторыі, дарогі.

Фізкультурна-аздараўленчы комплекс у Міханавічах узведзены дастаткова аператыўна. У сакавіку 2020-га пачалі будаўніцтва, у снежні 2021 года аб'ект быў здадзены. Тут прадугледжаны 25-метровы басейн на чатыры дарожкі і басейн, дзе будуць навучаць плаванню дзяцей, усіх ахвотных. У будучым з'явіцца аддзяленне воднага пола. Акрамя таго, у комплексе ёсць фітнес-зала, трэнажорная зала, цэнтр развіцця, турэцкая лазня і саўна, кафэ, фітабар. Побач з ФАКам уладкаваны адкрытыя футбольная, валейбольная, тэнісная пляцоўкі, аўтастаянка.

— Я думаю, што комплекс стане месцам прыцягнення не толькі жыхароў Міханавіч, але і суседніх аграгарадкоў, у цэлым Мінскага раёна, таму што мы размешчаны на самай галоўнай артэрыі — трасе М1. Можна сказаць, што ўсе дарогі вядуць да нас. І мы будзем рады ўсім, — адзначыла **старшыня Міханавіцкага сельвыканкама Святлана ДАВАЛЬЦОВА.** — Спадзяёмся, што ў нас будуць яшчэ новыя цікавыя аб'екты — аддзяленне рэабілітацыі са змешанай паліклінікай, гандлёвы цэнтр, дзе можна будзе не толькі зрабіць пакупкі, але і адпачыць усёй сям'ёй. Зямельныя ўчасткі для гэтага ёсць.

Асноўнае прызначэнне комплекса — падрыхтоўка спартыўнага рэзерву па плаванні. Але аздаравіцца тут могуць усе ахвотныя. Жыхары Міханавіч і іншых населеных пунктаў могуць набыць абанемент на паслугі або наведаць ФАК аднаразова ў той час, калі тут не будзе трэніровак юных плыўцоў. У комплексе будуць створаны групы па навучанні плаванню, прадугледжаны заняткі па аквастэпу, аквааэробіцы. Таксама тут будуць праводзіцца спартыўныя мерапрыемствы.

Спартыўны аб'ект стаў сапраўдным падарункам, які з нецярпеннем чакалі мясцовыя жыхары. Да гэтага ім даводзілася ездзіць у Мінск, каб паплаваць. Цяпер жа ўсё неабходнае для заняткаў спортам, аздараўлення — побач, пад бокам, што дае магчымасць сэканоміць час. Да комплексу зручна дабірацца з любога пункта пасёлка, паколькі ён пабудаваны практычна ў цэнтры аграгарадка.

На навасяле, як правіла, дораць падарункі. І гэтым разам кіраўнік цэнтральнага рэгіёна ўручыў дырэктару дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы Алене Даніловіч сертыфікат на 30 тысяч рублёў для набыцця неабходнага інвентару. Менавіта на баланс гэтай установы перададзены ФАК.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ДЗІЦЯЧЫ САДОК ПА СУЧАСНЫХ ТЭХНАЛОГІЯХ

Ён адкрыўся ў Магілёве ў маладзёжным мікрараёне «Спадарожнік», дзе жыве вялікая колькасць маладых сем'яў. Канцэпцыя пабудовы была распрацавана яшчэ ў 2019 годзе. Ініцыятарам і фундатарам выступіла прыватная кампанія RIKO. За сродкі Магілёўскага гарвыканкама зроблены праектна-каштарысная дакументацыя, фундамент, камунікацыі і добраўпарадкаванне.

Атрымаўся сапраўдны міні-гарадок для маленькіх насельнікаў — з басейнам, сучаснымі гульнявымі, спартыўнымі, музычальнымі і іншымі пакоямі, прызначанымі для развіцця творчых здольнасцяў дзяцей. У памяшканнях светла і ўтульна дзякуючы панарамным вокнам і шкляным дзвярам, прадуманаму абсталяванню, зручнай мэблі і цацкам. Яслі-садок № 118 разлічаны на 10 груп дзяцей ва ўзросце ад 2 да 6 гадоў. Чатыры выхавальнікі з 15 з'яўляюцца маладымі спецыялістамі. У штаце два музычныя кіраўнікі, тры кіраўнікі фізічнага выхавання, а таксама педагог-псіхолаг. Для гэтых спецыялістаў прадугледжаны асобныя кабінеты. Створаны ўмовы для аказання карэкцыйна-педагагічнай дапамогі выхаванцам.

— Сёння мы адкрылі дзіцячы садок на 200 месцаў у Магілёве, літаральна праз некалькі дзён урачыста адкрыецца дзіцячы садок у Бабруйску на 240 месцаў, а на працягу паўгода яшчэ адзін — у Шклове, — паведаміў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.** — Такія важныя аб'екты, як школы, дарогі, дзіцячыя садкі — частка сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы. Асабліва прыемна адкрываць дзіцячыя садкі. Гэта інвестыцыі ў нашых дзяцей, у будучае краіны. Робіцца ўсё, для таго каб гэтыя аб'екты былі сучаснымі і прыгожымі. Каб дзіця адчувала сябе тут як дома, каб яго фарміраванне адбывалася ў прыгожым асяроддзі. Самае важнае — выхаваць чалавека, які паважае бацькоў, педагогаў, свой горад, Радзіму... Спадзяёмся, што з'яўленне такіх аб'ектаў станоўча паўплывае і на дэмаграфічныя паказчыкі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Минскагротранс», г. Минск, ул. Бабушкина, д. 29**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов:
ПРОИЗВОДСТВЕННО-СКЛАДСКАЯ БАЗА,
расположенная по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 12. Состав лота:

Административное здание с пристройкой, инв. № 640/С-25825, общ. пл. 1035,3 кв. м. **Здание культурно-бытовое**, инв. № 640/С-25834, общ. пл. 370,2 кв. м. **Здание ОГМ**, инв. № 640/С-25839, общ. пл. 416,1 кв. м. **Мойка**, инв. № 640/С-25827, общ. пл. 48,4 кв. м. **Кузница, склад**, инв. № 640/С-25823, общ. пл. 443 кв. м. **Ремонтная мастерская,** инв. № 640/С-25832, общ. пл. 1220,4 кв. м. **Ремонтная мастерская**, инв. № 640/С-25836, общ. пл. 1369,6 кв. м. **Узел управления**, инв. № 640/С-25841, общ. пл. 68,3 кв. м. **Пропускной пункт**, инв. № 640/С-110286, общ. пл. 82,8 кв. м. **Наружные тепловые сети,** инв. № 640/С-110284, общ. пл. 0 кв. м. **Элементы благоустройства**, инв. № 640/С-110291, общ. пл. 2119,1 кв. м. **Автозаправочная**, инв. № 640/С-25838, общ. пл. 62,3 кв. м. **Железобетонная эстакада с очистными сооружениями**, инв. № 640/С-110285, общ. пл. 84,8 кв. м. **Ливневая канализация**, инв. № 640/С-110288, общ. пл. 0 кв. м. **Металлическая эстакада для сварочных работ 2 ед.**, инв. № 640/С-110287, общ. пл. 132,2 кв. м

Сведения о земельном участке: предоставлен на праве аренды по 13.09.2066 для содержания и обслуживания зданий и сооружений автомобильного транспорта, общ. пл. 4,1160 га

Начальная цена (с НДС 20 %) – 663 039,25 бел. руб.
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет – р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X. УНП 191 021 390. Получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **1 %** от цены продажи предмета электронных торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 20.10.2021

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
09.02.2022 с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 07.02.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

Контактные данные: +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

Утерянное свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя, выданное Фрунзенским райисполкомом КОННОВУ Павлу Игоревичу (УНП 192771793), **считать недействительным.**

ООО «СпецРеализация»

объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Триумфус»
(УНП 190809828, г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6 корпус 2, каб. 9),
находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

Дата и время проведения торгов: **18 февраля 2022 года**.
Начало – 10.00. Заявки принимаются с 19 января 2022 года по 17 февраля 2022 года.
Место проведения торгов: г. Минск, просп. Победителей, 31-1, комната переговоров ОАО «Гостиница Планета».
Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.
Продавец: **ООО «Триумфус» (УНП 190809828)** в лице антикризисного управляющего – директора частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

№ лота	Предмет торгов	Начальная цена, рублей без учета НДС	Шаг торгов	Задаток
1	Полуприцеп FRUEHAUFT34 TINL, рег. номер А 2651 В-5	6 580,00	5 %	5 %
2	Полуприцеп TRAILER S363ELIC, рег. номер А 2677 В-5	5 590,00	5 %	5 %

Для участия в торгах необходимо:
1. В срок до 15.00 **17 февраля 2022 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».
2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 15.00 17.02.2022 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 9.30 до 17.00 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41. Контактное лицо для осмотра лотов: Яскевич Дмитрий Васильевич, тел. 8 (029) 684-71-76.
3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:
- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенному соглашению в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен (будет в последующем установлен) собранием (комитетом) кредиторов.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 18 **февраля** 2022 **года** торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ»

Сведения о предметах торгов (продаваемом имуществе)			
№ предмета торгов	Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Начальная цена, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
1	Квартира по адресу: г. Минск, ул. Некрасова, 28-139 (этаж: 5-6, восьмикомнатная, общая площадь 148,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-605192), наименование – квартира 139, назначение – квартира	355 000,00	35 500,00
2	Изолированное помещение общей площадью 40,9 кв. м с инвентарным номером 500/D-708113334, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Некрасова, 28-264, наименование – чердачное помещение, назначение – помещение неустановленного назначения	96 400,00*	9 640,00

**Сумма НДС составляет 16 066,67 бел. руб.*

Продавец имущества: ОАО «МТЗ», 220070, г. Минск, ул. Долгобродская, 29.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1,5 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах 18.02.2022.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 40 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **18 февраля 2022 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 19.01.2022 по 16.02.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (029) 363 38 42; (017) 333-49-67.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36, (017) 360-42-22 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 333-49-67 (ОАО «МТЗ»).

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

Извещение об открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Гродно 22 февраля 2022 года

№ лота	Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения	Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб.	Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб.	Сумма задатка, руб.
1*	**Гродненская область, г. Гродно, ул. Перстунская, 10 (У-170, микрорайон «Зарица-5») 440100000003004809**	0,0954	Не завершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 400/U-111936, степень готовности 12 %. Фундамент: блоки фундаментные; наружная площадь 147 кв. м	218,04	40 425,13 (21 211,57; 19 213,56)	8 000
2*	**Гродненская область, г. Гродно, ул. Переломская, 21 (У-66, микрорайон «Зарица-5») 440100000003004768**	0,0891	Не завершенное незаконсервированное капитальное строение, степень готовности 12 %. Фундамент: фундаментные блоки железобетонные сплошные; наружная площадь (площадь застройки): 106 (106) кв. м; общая площадь 25,1 кв. м; составные части: подвал площадью 33 кв. м, наружные стены, перегородки – фундаментные блоки железобетонные сплошные; перекрытия – плита железобетонная	345,42	27 788,58 (9 843,84; 17 944,74)	5 500

** – Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома. Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 30.05.2019 г. № 371 «О возмещении затрат на строительство объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».*

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы; заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно предоставляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится 22 февраля 2022 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 24 января по 16 февраля 2022 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактные телефоны: **+ 375 (152) 626055, 626056.** Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу РБ **http://gki.gov.by/ru/auction-auinf_object,** Гродненского областного исполнительного комитета **http://region.grodno.by,** Гродненского городского исполнительного комитета **http://www.grodno.gov.by,** ГП «Гродненский центр недвижимости» **http://gcn.by**

КАБ ВАДЫ НАПІЦЦА, ТРЭБА ЁЙ ПАКЛАНІЦЦА

«ВОДНЫЯ ФОНДЫ»

Уключэнне ў дзяржпраграму «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» паказчыка па перакладцы сетак са скончаным тэрмінам эксплуатацыі дазволіла павысіць тэмпы па іх абнаўленні, аднак гэтага недастаткова, каб вярнуць працэс старэння сетак назад, упэўнены **Алег КОНАН, генеральны дырэктар «Белводаканала»**:

— Абнаўленне сетак водазабеспячэння складае менш за адзін працэнт, а каналізацыйных — 0,6 %. Адна з ключавых праблем па замене сетак — нездавальняльны тэхнічны стан магістральных сетак каналізацыйных калектараў вялікіх дыяметраў, якія размешчаны ў шчыльнай забудове. Выкананне работ па перакладцы такіх сетак патрабуе вялізных фінансавых сродкаў, якіх у водаканала проста няма. Сёння ў асноўным прадпрыемства за кошт уласных грошай мяняе размеркавальныя сеткі малых дыяметраў. Але гэта не вырашае задачу па павышэнні надзейнасці сістэм і бесперабойнасці аказання паслуг насельніцтву. На замену зношаных сетак спатрэбіцца больш як 11 млрд рублёў. Гадавая ж сума, налічаная на амартызацыю ў цэлым па паслузе водазабеспячэння і водаадвядзення, — крыху больш за 119 мільёнаў.

Дзеля дадатковага фінансавання праграмы па замене сетак гендырэктар прапаноўвае стварыць фонды замены сетак водазабеспячэння і водаадвядзення пры абласных і Мінскім гарадскім выканкамах. Асноўнай крыніцай фінансавага папаўнення такіх фондаў павінен стаць спецыяльны складнік у тарыфах на паслугі водазабеспячэння і водаадвядзення для насельніцтва і юрыдычных асоб. А паўнамоцтвы па вызначэнні памеру адлічэнняў у фонд мяркуецца замацаваць за камітэтамі.

— Адлічэнні ў фонд замены сетак на адзінку паслуг водазабеспячэння прапаноўваецца вызначаць у рублях на адзін метр кубічны, зыходзячы з гадавой патрэбы на замену сетак і ўсіх наяўных крыніц фінансавання, аднак не больш за 10 % ад планавых затрат на адзінку паслуг. Пры гэтым адлічэнні ў фонд замены сетак у сярэднім па краіне на адзінку паслугі водазабеспячэння складзе 9,6 капейкі, а водаадвядзення — 7,9 капейкі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Для насельніцтва рост тарыфаў на паслугі водазабеспячэння і каналізацыі (ВІК) праз адлічэнні ў фонды не стане істотным. Для двухпакаёвай кватэры з трыма жыхарамі плата ў жыроўцы павялічыцца на 40 капеек за водазабеспячэнне і 31 капейку — за водаадвядзенне. Затое гэта дазволіць сакумуляваць і накіраваць на замену сетак водазабеспячэння і каналізацыі больш за 77 мільёнаў рублёў у год.

ЗАМЕСТ «ПРАСЦЕЙТАННЕЙ-ХУТЧЭЙ» — ТЭХНІЧНЫ АЎДЫТ

Існуючыя крытэрыі замены сетак водазабеспячэння і каналізацыі адносна завяршэння тэрміну іх карыснага выкарыстання адлюстроўвае толькі адзін з фактараў ацэнкі стану трубаправода — знос па бухгалтарскім уліку. Пры гэтым не ўлічваецца эксплуатацыйны стан сетак, і часта яны мяняюцца па прынцыпе «прасцейтанней-хутчэй», а не выходзячы з рэальнай неабходнасці. І гэта, вядома, не вырашае пытанне замены праблемных аварыйных участкаў, падкрэсліў дырэктар «Белводаканала».

Каб павысіць надзейнасць сістэм водазабеспячэння, ён прапаноўвае вызначыць базы для фарміравання пераліку сетак водазабеспячэння і каналізацыі, якія павінны быць заменены першапачаткова. Асновай для вызначэння чарговасці мусіць стаць менавіта інфармацыя пра фактычны стан сетак, якая павінна атрымлівацца па выніках комплекснай ацэнкі тэхнічнага аўдыту сістэм водазабеспячэння і каналізацыі кожнага населенага пункта.

— Прапаноўваю вылучыць тэхнічны аўдыт сістэм ВІК у асобную працэдуру і зрабіць яе абавязковай для ўсіх прадпрыемстваў, якія маюць сістэмы цэнтралізаванага водазабеспячэння і каналізацыі. Акрамя таго, неабходна ўстанавіць адзіныя патрабаванні да правядзення аўдыту і падвядзення яго вынікаў. Асноўныя задачы правядзення тэхнічнага аўдыту — вызначэнне фактычных значэнняў паказчыкаў надзейнасці і якасці эксплуатацыйных сістэм цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення, атрыманне і падрыхтоўка даных для распрацоўкі перспектыўных схем развіцця сістэм водазабеспячэння адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, а таксама для фарміравання доўга- і кароткатэрміновых праграм па мадэрнізацыі і рэканструкцыі сістэм водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі.

У сувязі з выкладзеным Алег Конан лічыць мэтазгодным замяніць існуючы тэрмін «перакладка сетак са скончаным тэрмінам эксплуатацыі» на «замена сетак водазабеспячэння і каналізацыі, якія знаходзяцца ў нездавальняльным тэхнічным стане».

АЧЫШЧАЛЬНЫЯ ЗБУДАВАННІ І ЭКАЛАГІЧНЫ ПАДАТАК

Павышэнне надзейнасці сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення звязана таксама і з рэканструкцыяй ачышчальных збудаванняў і каналізацыі. Арганізацыямі водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі (ВКГ) цяпер эксплуатуецца 261 каналізацыйная ачышчальная забудова, больш за палову якіх мае патрэбу ў рэканструкцыі. Адна з галоўных прычын іх неэфектыўнай работы — фізічны знос (амаль усе ачышчальныя збудаванні былі створаны ў краіне ў канцы 70-х — пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя).

У межах падпраграмы «Чыстая вада» дзяржпраграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» плануецца рэканструяваць 70 ачышчальных збудаванняў поўнай біялагічнай ачысткі, на што накіраваць 1 млрд 383 млн рублёў. На 26 аб'ектаў, прынамсі, мяркуюць прыцягнуць замежныя банкаўскія сродкі.

Для рэалізацыі прыродаахоўных мерапрыемстваў — рэканструкцыі ачышчальных збудаванняў — трэба разглядаць і іншыя крыніцы фінансавання, лічыць Алег Конан:

— Арганізацыі ВКГ плацяць экалагічны падатак, які летась склаў больш за 28 млн рублёў. Штогод жа ў краіне налічваецца і выплачваецца прадпрыемствамі больш за 200 мільёнаў гэтага падатку. Лічу неабходным стварыць цэнтралізаваны фонд, які будзе фарміравацца са сродкаў выплачванага прадпрыемствамі экападатку і накіроўваць сакумуляваныя ў фондзе сродкі выключна на рэканструкцыю і будаўніцтва камунальных ачышчальных збудаванняў.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Надвор'е

ВЕТРАНА...

Мокры снег, а ўначы падмарозіць, таму галалёд, а на дарогах — галалёдзіца

Ураганны вецер быў у пятніцу, нешта падобнае назіраем і ў пачатку гэтага тыдня. А наогул, на гэтым тыдні чакаецца досыць ветранае і ўмерана марознае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У аўторак на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег, у асобных раёнах мяцеліца, месцамі па Магілёўскай вобласці моцны снег. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. На большай частцы тэрыторыі краіны прагназуецца ўзмацненне ветру ўначы парывамі да 19—24 м/с, месцамі — да 25—27 м/с, удзень — да 15—20 м/с, месцамі — да 21—24 м/с. Тэмпература паветра ад нуля да мінус 6 градусаў.

У сераду на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе снег, мокры снег, удзень па захадзе магчымы дождж. Удзень у асобных раёнах магчыма невялікая адліга. Месцамі туман, галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў па захадзе да 12 марозу па ўсходзе, пры праясненнях — мінус 13—15 градусаў. Удзень будзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла.

У чацвер на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. Месцамі чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. У асобных раёнах прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла. Удзень чакаецца ад мінус 3 градусаў да плюс 2.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу, 21 студзеня, часам чакаецца снег, месцамі мяцеліца і ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Усталюецца ўмерана марознае надвор'е. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—7 марозу, удзень — ад нуля да мінус 5.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кіеўскі суд пачаў разглядаць справу Парашэнкі

У панядзелак былы прэзідэнт Пётр Парашэнка вярнуўся ва Украіну з Варшавы. Паводле яго слоў, улады не хацелі ўпускаць яго ў краіну. У Дзяржпагранслужбе назвалі гэта спекуляцыямі. Палітык прысутнічае на пасяджанні Пячэрскага суда Кіева.

Парашэнка стаў падазраваным у дзяржаўнай здрадзе і садзейнічанні тэрарызму па справе аб пастаўках вугалю з Данбаса. З сярэдзіны снежня ён знаходзіўся за мяжой у дыпламатычным турнэ і абяцаў вярнуцца 17 студзеня. Нядаўна суд наклаў арышт на ўсю яго маёмасць. Пры гэтым у офісе ўкраінскага генпракурора заяўлялі, што папросяць арыштаваць і самога палітыка з магчымасцю ўнясення закладу прыкладна ў 37 мільёнаў долараў. Украінская партыя «Еўрапейская салідарнасць» лічыць гэта палітычнымі рэпрэсіямі. Перад вылетам у Кіеў Парашэнка заявіў РІА «Навіны», што не баіцца арышту, бо адчувае за сабой праўду і падтрымку народа Украіны.

Раней экс-прэзідэнт заяўляў, што супраць яго ўзбуджана 130 крымінальных спраў, але каля 40 з іх ужо закрыты.

Кіраўнік МЗС Японіі спадзяецца на прагрэс у дыялогу з Расіяй па Курылах

Міністр замежных спраў Японіі Ёсімаса Хаясі, выступаючы падчас пленарнага пасяджэння парламента краіны, выказаў надзею на дасягненне прагрэсу па пытанні канкрэтызацыі сумеснай з Расіяй гаспадарчай дзейнасці на Паўночных тэрыторыях, як афіцыйны Токіа называе паўднёвыя астравы Курыльскай грады.

«Неабходна весці цесны дыялог паміж лідарамі і кіраўнікамі МЗС для пашырэння дыялогу на падставе існуючых дамоўленасцяў, у тым ліку на падставе дасягнутага ў Сінгапуры пагаднення і сумеснай дэкларацыі паміж Японіяй і СССР», — адзначыў ён.

Раней прэм'ер-міністр Японіі Фуміа Кісіда, выступаючы з праграмнай прамовай на пасяджэнні ніжняй палаты парламента, заявіў, што ўлады маюць намер працягваць весці перагаворы з Расіяй для вырашэння тэрытарыяльнага пытання і заключэння мірнага дагавора.

Японія прэтэндуе на астравы Кунашыр, Шыкатан, Ітуруп і Хабамаі, спасылаючыся на двухбаковы Трактат аб гандлі і межах 1855 года. Вяртанне астравоў Токіа паставіў умовай заключэння мірнага дагавора з РФ, які пасля заканчэння Другой сусветнай вайны так і не быў падпісаны.

Гінцбург растлумачыў, у чым небяспека «жывой вакцыны»

Спецыялісты працягваюць абмяркоўваць, наколькі верагодна тое, што новы штам каранавіруса «амікрон» можа стаць «жывой вакцынай». Дырэктар Цэнтра імя Гамалеі Аляксандр Гінцбург лічыць, што такая магчымасць ёсць у любой разнавіднасці віруса. Толькі зыход можа быць розны, аж да смерці. Раней вірусолагі звярталі ўвагу на тое, што новы варыянт COVID-19 больш заразны, але менш лятальны. Таму многія лічаць, што атрымаць антыцелы да каранавіруса стала прасцей.

«Калі чалавек перанёс захворванне «на нагах», то, лічыце, гэта «жывая вакцына». Але ніхто не скажа, якія будуць наступствы такой «вакцынацыі», у адрозненне ад вакцынацыі. Таму што ўскладненні ад «жывой вакцыны» бываюць розныя, аж да смяротных зыходаў», — заявіў Аляксандр Гінцбург у каментарыі ТАСС.

З пачатку снежня мінулага года спецыялісты гавораць аб тым, што новы штам COVID-19 «амікрон» з-за нізкіх паказчыкаў смяротнасці і высокага распаўсюджвання можа стаць «жывой вакцынай».

Будзь здароў!

ХАРЧАВАННЕ ПА ІТ

Маскоўскі прафесар пра ежу, якая можа пазбавіць ад інсультаў і інфарктаў

Каля дзесяці гадоў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій плённа супрацоўнічае з Маскоўскім універсітэтам тэхналогій і кіравання імя К. Разумоўскага. Сумесныя навуковыя канферэнцыі, анлайн-сустрэчы, круглыя сталы, выставы, конкурсы прафесійнага майстэрства — усё гэта робіць жыццё дзвюх ВНУ больш насычаным і дынамічным. Напрыканцы мінулага года ў Магілёў прыехала дэлегацыя выкладчыкаў і студэнтаў з Масквы. У тым ліку і доктар тэхнічных навук загадчык кафедры біятэхналогій і прадуктаў харчавання з расліннай і жывёльнай сыравіны Ігар НІКІЦІН. У магілёўскім універсітэце ён прачытаў некалькі лекцый, прысвечаных такому актуальнаму сёння кірунку, як персаніфікаванае харчаванне. Гэта тэма якраз і была крыніцай даследавання для вывучэння яго доктарскай дысертацыі. Нягледзячы на вельмі сціслы графік работы, прафесар знайшоў хвілінку, каб пагутарыць з карэспандэнтам «Звязды» наконт апошніх тэндэнцый у грамадскім харчаванні.

ПЕРШЫ КАЗАЧЫ

Дарэчы, гэта яшчэ адна назва маскоўскага ўніверсітэта. На сёння гэта адзіная ў Расіі ўстанова, якая ўзаемадзейнічае з сайтам па казацтве пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі і бярэ на мэтавыя месцы дзяцей казакоў, у тым ліку з іх каледжаў і кадэцкіх карпусоў. «Гэта элемент нашай патрыятычнай падрыхтоўкі грамадзян, сацыяльная місія ўніверсітэта», — удакладняе Ігар Нікіцін. У савецкі час вышэйшая навучальная ўстанова называлася Усесаюзны завочны інстытут харчовых тэхналогій і рыхтавала кадры для ўсёй харчовай прамысловасці Савецкага Саюза. Потым адбылася грунтоўная трансфармацыя, у выніку якой акцэнт быў зроблены на стацыянарную форму адукацыі.

Універсітэт вядзе вялікую навуковую работу ў галіне грамадскага харчавання і з'яўляецца адным з лідараў у гэтым кірунку. З развіццём ІТ і медыцынскіх тэхналогій узнікаюць новыя сучасныя формы, якія дазваляюць вырашаць праблемы ў харчовай прамысловасці і ісці ў нагу з перадавымі сусветнымі тэндэнцыямі.

— Харчаванне — адзін з найважнейшых фактараў, які ўплывае на здароўе чалавека ў сучасным свеце нароўні з заняткамі спортам, — канстатуе Ігар Нікіцін. — Гэта два самыя важныя фактары, якія дазваляюць папярэдзіць развіццё так званых элементарна залежных захворванняў — дыябету, інфарктаў, інсультаў, астэапарозаў. Гэтыя захворванні ўзнікаюць у сувязі з няправільным ладам жыцця і няправільным харчаваннем. Яны спеюць вельмі доўга. У нас цяпер ва ўсіх дэфіцыт вітаміну Д. Калі вы здасце кроў на аналіз, вітамін будзе ў вас або на мяжы, або ніжэйшы за норму. З аднаго боку, гэта дрэнна, з іншага — сітуацыя трывіяльная: такое сустракаецца амаль у 80 % жыхароў Расіі і Беларусі. Для ўсіх, хто жыве вышэй 40-й паралелі, гэта характэрна. У доўгатэрміновай перспектыве гэта прыводзіць да астэапарозу. Сто працэнтаў, што ў чалавека да 60 гадоў будуць гэтыя захворванні. Тая ж самая гісторыя з вітамінамі С, групы В (да 50 % людзей маюць дэфіцыт). Выправіць гэта можна, скарэкціраваўшы свой рацыён, нормы харчавання. Але, каб гэта атрымалася, трэба прыкласці намаганні. Такога, каб чалавек сказаў сабе, што з сённяшняга дня пачне піць вітамін Д і будзе так рабіць пастаянна, на жаль, не бывае. Бо ён не бярэ пад увагу, забывае. І для дзяржавы задача № 1 — стварыць такія ўмовы, пры якіх гэтыя хваробы не наступалі б. Гэта — прапаганда здаровага ладу жыцця, вытворчасць якасных прадуктаў і ўкараненне іх у практыку харчавання.

ПЕРСАНАЛЬНАЕ МЕНЮ

Прафесар лічыць, што нельга ўсіх людзей карміць аднолькава, бо ў кожнага маецца нейкая свая схільнасць. Напрыклад, два чалавекі з'елі адну і тую ж страву, але адзін пасля гэтага адчувае сябе добра, а другі — не.

— Улічваць індывідуальныя патрэбнасці сёння стала магчыма, паколькі медыцынскія і ІТ-тэхналогіі настолькі прасунуліся наперад, што мы можам з дапамогай смартфона сабраць усю інфармацыю пра сябе (колькасць пройдзеных за дзень крокаў, працягласць сну, частата пульсу і гэтак далей) і на падставе яе распрацоўваць меню і рацыён, якія будуць больш канкрэтна задавальняць нашы патрэбы, — кажа Ігар Нікіцін. — Такое харчаванне папярэджвае развіццё небяспечных захворванняў у доўгатэрміновай перспектыве. Мы як навуковая ўстанова больш распрацоўваем метадалогію і навуковыя асновы гэтага падыходу. Але ўжо ёсць шэраг кампаній, якія ўкараняюць гэта ў практыку. Напрыклад, нашы калегі з 1-га медуніверсітэта імя І. Сечанава з кафедры «Малекулярная біялогія». Можна прыйсці туды і зрабіць платны аналіз. А мы ў сваю чаргу распрацавалі праграмнае забеспячэнне, якое дазволіць аўтаматычна складаць рацыён. Застаецца толькі прытрымлівацца яго. Гэта можа звесці паходы да ўрачоў да мінімуму. Харчаванне будзе кантраляваць пастаянна ў рэжыме анлайн.

Ёсць такое паняцце — мікрабіёта. Гэта колькасць бактэрый, якія жывуць у нашым кішэчніку. Іх склад мяняецца ў залежнасці ад таго, што мы ядзім, якія прымаем лекі, хварэем альбо здаровыя. Згодна з тэорыяй акадэміка Аляксандра Уголева, мікрабіёта сінтэзуе да 10 % карысных рэчываў для нашага арганізма. А 90 % гэтых рэчываў мы атрымліваем з ежай. Мікрабіёта, якая функцыянуе няправільна, з часам прыводзіць да сур'ёзных захворванняў.

МЯСА З ПРАБІРКІ

Дастаўка ежы з дапамогай дронаў, харчовыя прынтары, картрыджам для якіх з'яўляецца харчовая сумесь, — усё гэта пакуль здаецца нечым фантастычным. Між тым гэта наша не вельмі далёкая будучыня.

— Робіце харчовую сумесь, а прынтар выдае тое печыва, якое вам патрэбна, — усміхаецца прафесар. — Калі казаць пра харчовыя прадукты, то мы з вамі сёння знаходзімся ў такім часе, калі ўзнікае шмат новых. Традыцыйныя становяцца нават ужо незапатрабаванымі. Звярніце ўвагу на тое, чым харчуецца моладзь: снікерсы, чыпсы і гэтак далей. Гэта дастаткова шкодная ежа, але яе можна зрабіць карыснай. Мой калега з Пісера распрацаваў спосаб ашчаднай сушкі яблык, морквы, гарбуза: сушыць іх без страты вітамінаў і робіць снэкі. Тыя снэкі, якія сёння распаўсюджаны, — не наш прадукт. А трэба ўсё пераканвертаваць так, каб дзеці купілялі сваё і елі на здароўе.

— А што вы маеце на ўвазе, кажучы пра новыя прадукты?

— Узяць, напрыклад, хлеб. Не ўсё, што мы называем хлебам, ім з'яўляецца. У класічнай тэрміналогіі хлеб — гэта прадукт браджэння. А сёння шмат якія прадпрыемствы ігнаруюць гэтую стадыю, выкарыстоўваюць хімічныя разрыхляльнікі, узбіўны хлеб, які атрымліваецца шляхам пенаўтварэння. Знешне гэта хлеб, а па тэхналогіях невядома што. Або ўзяць, напрыклад, раслінае мяса. Мы называем гэта мясам, хоць яно такім і не з'яўляецца. Але з яго могуць зрабіць такую катлету для гамбургера, што не адрозніць. І гэта пры тым, што ў ёй ні грама мяса. Гэта выйсце для прадуктовай сістэмы, таму што вытворчасць кілаграма свежай ялавічыны абыходзіцца для экалогіі вельмі дорага. Я ўжо не кажу пра цану вытворчасці. Сёння ёсць нават такое, што раслінае мяса робяць не з раслінага, а з клетачнага. Вырошчваюць яго ў прабірцы. Гэта пытанне найбліжэйшых 5—10 гадоў. Яно нават па клетачным складзе будзе ідэнтычнае.

ПАЛАСАВАЦЦА НАСЯКОМЫМІ НЕ ЖАДАЕЦЕ?

Маскоўскі прафесар расказаў, што ўжо цяпер некаторыя вытворцы атрымліваюць танны і высакаякасны бялок з альтэрнатыўных крыніц бялку, такіх як, напрыклад, конікі альбо мухі.

— Жывёл ім ужо кормяць і людзей у найбліжэйшы час будуць гэтым карміць, — папярэджвае вучоны. — Бялок з насякомых па сваіх паказчыках, дарэчы, нічым не горш. Калі вы не ведаеце, што гэта, ніколі не падумаеце пра мух і конікаў.

— А навошта нам такое трэба? — не разумею я. ***— Чаму б не развіваць натуральную гаспадарку — кароў, свіней і гэтак далей?***

— Тут ёсць як мінімум два фактары. Па-першае, існуючая сістэма харчовага забеспячэння пабудавана на прамысловых маштабах вытворчасці і з'яўляецца прычынай вялікай колькасці захворванняў у людзей. Таму што яна забяспечвае колькасць, але не заўсёды якасць. Памідоры, якія выраслі на летніку, або тыя, што ў цяпліцы на гідрапоніцы — дзве прынцыпова вялікія розніцы. У іх розны склад, у апошніх вітамінаў нашмат меней. Але прамысловая вытворчасць мае іншыя мэты — усіх накарміць. Другая праблема ў тым, што вытворчасць прадуктаў наносіць шкоду навакольнаму асяроддзю. Нельга гэта бясконца развіваць. Трэба шукаць новыя падыходы.

ЗДАРОВАЕ ХАРЧАВАННЕ ПЕРШ ЗА ЎСЁ

Беларусь славіцца якасцю прадуктаў. Яшчэ мы можам сабе дазволіць стварацца экалагічна чыстую і якасную прадукцыю. Але так адбываецца далёка не ва ўсіх краінах. Да таго ж у харчаванні таксама ёсць трэнды. І шмат пасляродўнікаў.

— Гэта як з аўто, — прыводзіць прыклад суразмоўца. — 120 гадоў таму людзі ездзілі на конях, але з'явіліся машыны, і яны перасялі на іх. З харчаваннем адбываецца нешта падобнае. Гэта працэс, які як хваля: яго нельга прыпыніць, можна толькі правільна да яго адносіцца і старацца ўплываць, каб не адбывалася злоўжыванняў і шкоды.

— І якія прадукты вы б параілі есці?

— У сучасным свеце складана даваць якія-небудзь парады. Паўтару словы грэчаскіх і славянскіх філосафаў. Авіцэна казаў, што розніца паміж лекамі і ядам толькі ў дазіроўцы. А Павел Флорэнскі папярэджваў, што няма ніводнай добрай рэчы, якая ў спалучэнні б са словам «шмат» не стала б жахлівай. У харчаванні, як у любой сферы жыцця, павінна быць памяркоўнасць. Няма прадуктаў, якія вылечаць вас, і няма такіх, якія, з'еўшы адзін раз, вы на ўсё жыццё сапсуяце сабе здароўе. Пытанне ў сістэме. Правільна пабудаваная сістэма харчавання забяспечыць жыццё і здароўе на доўгія гады, а няправільная, наадварот, заб'е, але гэта адбудзецца не за дзень і нават не за год. Таму важна правільныя звычкі ў харчаванні заклаці з дзяцінства.

— І якім чынам?

— Для мяне як бацькі гэта таксама праблема. Дзеці — геданісты, яны любяць усё салодкае і стрэчваюць волю, якая ў іх яшчэ слабая. Гатовы за марожанае рабіць урокі цэлы дзень. Але тут лепш выхоўваць дзяцей уласным прыкладам. Калі бацькі ядуць сасіскі, а дзецям кажуць, што гэта шкодна, ні да чаго добрага такое не прывядзе. У сям'і павінна быць правільная сістэма харчавання.

— А як вы харчуецеся? Каву, напрыклад, раніцай ужываеце?

— Каву не п'ю зусім. Я яе проста не люблю. Але я за тое, каб раніцай снедаць. Сёння, напрыклад, з'еў аўсянку, салату з капусты і нават катлету. Вялікія перапынкі ў харчаванні — не вельмі добра. Трэба харчавацца часта і невялічкімі порцыямі. Калі раніцай нічога не ясце, у абед нешта перахопліваеце, а вечарам наядаецеся, нічога добрага з гэтага не атрымаецца. Трэба есці 3-4 разы — спартсмены, напрыклад, харчуюцца па 8 разоў, кожныя 2 гадзіны. Паўтаруся, правільнае харчаванне павінна фарміравацца з дзяцінства і стаць звычкай.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.

Узровень

«Вучоны года» — спецыяліст у галіне матэрыялазнаўства

Прэзідыум НАН Беларусі зацвердзіў вынікі конкурсу «Вучоны года Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — 2021» і прыняў рашэнне прысвоіць гэта званне генеральнаму дырэктару Дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання парашковай металургіі, доктару тэхнічных навук, прафесару, акадэміку Аляксандру Ільюшчанку.

Высокага звання вучоны ўдастоены за распрацоўку высокаэфектыўных тэхналогій і абсталявання для атрымання новых кампазіцыйных матэрыялаў, перадавых узораў спецтэхнікі, стварэнне аўтаматызаванай інавацыйнай вытворчасці прамысловых эмульсійных выбуховых рэчываў, высокатэхналагічных вырабаў для аэракасмічнай і абароннай прамысловасці, паражальных парашковых элементаў, парашковых дэталяў і элементаў спецвырабаў, экспартнай навукова-тэхнічнай прадукцыі.

Акадэмік Аляксандр Фёдаравіч Ільюшчанка — вядомы ў нашай краіне і за мяжой вучоны ў галіне матэрыялазнаўства, інжынерыі паверхняў і парашковай металургіі, доктар тэхнічных навук, прафесар. Ён аўтар 1085 навуковых работ, у тым ліку 28 манаграфій. Прыкладныя распрацоўкі абаронены 17 аўтарскімі сведчаннямі і 177 патэнтамі. Аляксандр Ільюшчанка падтрымлівае сувязі з вядучымі навуковымі цэнтрамі шэрагу краін і міжнароднымі арганізацыямі. З'яўляецца правадзейным членам Акадэміі ваенных навук Расійскай Федэрацыі, членам Амерыканскага таварыства па матэрыялах (ASM ID 262841).

У 2013 годзе яму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь».

Конкурс «Навуковец года НАН Беларусі» заснаваны ў студзені 2018 года. Яго мэта — выяўленне і заахвочванне навукоўцаў з ліку акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў, якія найбольш эфектыўна працуюць у конкурсным годзе. А таксама навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, якія працуюць у навуковых арганізацыях НАН Беларусі, маюць значныя асабістыя дасягненні ў навукова-даследчай дзейнасці, уносяць важкі ўклад у развіццё навуковай і інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, умацаванне міжнароднага аўтарытэту Акадэміі навук Беларусі, падрыхтоўку кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі.

Званне «Вучоны года» прысвойваецца штогод напярэдадні святкавання Дня беларускай навукі на падставе вынікаў конкурснага адбору. Ужо было праведзена чатыры конкурсы, а звання «Вучоны года» ўдастоены чацвёра навукоўцаў: у 2017 годзе — член-карэспандэнт НАН Беларусі Эмілія Каламіец, у 2018 годзе — акадэмік Мікалай Казак, у 2019 годзе — член-карэспандэнт Аляксандр Кавалёна, у 2020 годзе — акадэмік Уладзімір Агабекаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

КРАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ШМАТАБЛІЧЧА

Што вылучае Іўе сярод іншых беларускіх гарадоў і якая трагедыя дагэтуль у памяці яго жыхароў?

Са старажытных часоў Іўеўшчына адметная сваёй шматнацыянальнасцю. На працягу многіх стагоддзяў у гэтым невялікім гарадку, што на Гродзеншчыне, жывуць праваслаўныя, каталікі і мусульмане (да Вялікай Айчыннай вайны — яшчэ і іудзеі). Жывуць мірна, паважаюць традыцыі адзін аднаго. А яшчэ іўеўчане любяць працаваць на зямлі, але ўмеюць і адпачываць — адзін памідорны фестываль, вядомы не толькі на ўсю Беларусь, а і далёка за мяжой, чаго варты!

Ужо з першых хвілін знаходжання ў райцэнтры нават непадрыхтаваны турыст зразумее — паселішча старажытнае. Дамы і пабудовы, узведзеныя два стагоддзі таму, вялікая колькасць храмаў, вузкія вулачкі... Уяўляеш, як калісьці шпацыравалі па іх Радзівілы ці Сапегі, Агінскія або Гаштольды. Руіны Геранёнскага замка, які належаў апошнім, дагэтуль прыцягваюць выпадковых і не толькі падарожнікаў. Але калі пра гісторыю гэтага мястэчка мы нядаўна пісалі, то чым жывуць Геранёны сёння, за рэдкім выключэннем, ведаюць толькі месцічы.

КВЕТКАВЫХ СПРАЎ МАЙСТАР

Між іншым, аграгарадок славіцца сваімі майстрамі. Наведаўшы Геранёнскі Дом культуры, які з'яўляецца філіялам Іўеўскага цэнтра культуры і вольнага часу, дзівішся, наколькі таленавітыя і працавітыя людзі жывуць у мястэчку. Якія прыгожыя кампазіцыі з саломы, што іначай як творамі мастацтва і не назавеш, стварае загадчык сектара рамёстваў і традыцыйнай культуры Юзэфа Старасціна! Дзякуючы гэтай таленавітай жанчыне можна ўбачыць, як выглядаў той жа Геранёнскі замак: яго копія — упрыгажэнне саламянай калекцыі, багатай на самыя розныя вырабы.

Чаго толькі не ўмее рабіць майстар сектара рамёстваў і традыцыйнай культуры Ганна Пуйдак... Жанчына таксама займаецца саломапляценнем, роспісам па шкле, прыгожа малюе. Адно з апошніх захапленняў — прасаваная флорыстыка. Складана перадаць, якія прыгожыя пейзажы, нацюрморты і кампазіцыі атрымліваюцца з засушаных кветак і іншых раслін. Карціна ў рамцы — вынік работы, якой папярэднічае доўгі падрыхтоўчы працэс.

— Перш чым наклеіць кветку, яе трэба засушыць, — дзеліцца сакрэтамі майстэрства Ганна Іванаўна. — У кожнага майстра свая тэхналогія засушкі. Я дзеля гэтай мэты карыстаюся звычайнай кнігай. Кожная кветка сохне паронаму. Калі браткі высыхаюць за тры-пяць дзён, то цюльпаны будуць сохнуць два тыдні. Васількоў не засушыш у кнігах: кветкі страчваюць свой колер. У такім выпадку выручыць прас.

Найбольш непатрабавальнай кветкай майстар сектара рамёстваў і традыцыйнай культуры называе белы рамонак. Таксама жанчына прызнаецца, што любая расліна можа ўпрыгожыць карціну, нават калі гэта пустазелле. «Самы просты элемент у флорыстыцы падкрэслівае прыгажосць нечага іншага, — заўважае Ганна Пуйдак. — Цікава, што і кветкі, якія растуць у розных краінах, не канфліктуюць, а сыходзяцца ў адной кампазіцыі. Кожная кветка мае сваю біяграфію, жыццёвую лінію: як яе паказаць, усё залежыць ад фларыста-мастака. Які б у нас ні быў настрой, гледзячы на прыродную прыгажосць, мы адчуваем сябе добра.

Ганна ПУЙДАК — майстрыха на ўсе рукі. Апошнім часам яна захапілася стварэннем прыгожых карцін з засушаных кветак.

А яшчэ флорыстыка — гэта фітатэрапія: бярэшся за работу і пра ўсе хваробы забываешся».

Прасаванай флорыстыцы, як і ўсяму астатняму рамяству, Ганна Іванаўна вучылася сама. Гэта цяпер самаадукацыяй можа займацца кожны: вялікая колькасць літаратуры, інтэрнэт. Раней жа сакрэты майстэрства спасцігалі шляхам проб і памылак. І не дзеля самаразвіцця, як прынята ў сучасным свеце, а каб зарабіць якую-небудзь капейку. А яна Ганне Пуйдак была патрэбная: жанчына нарадзіла і выхавала пяцярых дзяцей, носіць званне «Маці-гераіня». Майстрыха ўжо даўно на пенсіі, але яна ніколі не сядзіць без работы, заўсёды вучыцца нечаму новаму: у хуткім часе плануе займацца вырабамі з бяросты.

ЦЭНТР ДУХОЎНАСЦІ І СІЛЫ

У Іўі знаходзіцца найстарэйшая мячэць краіны. На малітву ў храм 1882 года пабудовы дагэтуль прыходзяць людзі. Сёння татарская абшчына Іўеўскага раёна складае каля 500 чалавек. Гэта самая буйная абшчына ў Беларусі з карэнных татараў, якая сёлета адсвяткуе сваё 625-годдзе.

Традыцыйна мячэць ажывае па пятніцах, калі ў мусульман дзень адпачынку і калектыўнай малітвы. Для жанчын яна неабавязковая, аднак яны ўсё роўна імкнуцца ў гэты дзень наведаць храм. А вось мужчынам без уважлівай прычыны калектыўную малітву прапускаць нельга. У святы ў мячэці ўвогуле шматлюдна: каб выказаць павагу суседзям-мусульманам, у храм прыходзяць прадстаўнікі і іншых веравызнанняў.

— Калі людзі сабраліся на малітву і зачынілі ў мячэці дзверы, не пускаючы каго-небудзь, іх малітва будзе несапраўдная, — кажа **старшыня мусульманскай рэлігійнай абшчыны г. Іўе Іван ШАБАНОВІЧ.** — Для людзей з добрымі намерамі, няхай гэта нават не мусульмане, у мячэці заўсёды павінна быць месца.

«Каб зразумець Іўеўшчыну, трэба абавязкова пабываць і ў Музеі нацыянальных культур, які адзін такі на ўсю краіну. У экспазіцыйных залах падрабязна расказваецца аб гісторыі ўсіх народаў, якія маюць дачыненне да іўеўскай зямлі».

Гісторыя іўеўскай мячэці вельмі цікавая. Татарская абшчына тут існавала даўно, але доўгі час свайго храма не мела. Лес на пабудову мячэці дала тагачасная гаспадыня Іўя — графіня Эльвіра Замойская. Яна была каталічкай, жыла ў Варшаве, але з татарамі мела добрыя адносіны. Па словах Івана Шабановіча, мячэць будавалі цесляры-яўрэі.

З 1882 года, калі быў пабудаваны храм, ён зусім не змяніўся. Вядома, пэўныя рамонтныя работы за гэты час вяліся, але асаблівых змен мячэць не зведала. Нават немцы ў гады Вялікай Айчыннай вайны пашкадавалі храм. Не пацярпеў ён і ў бязбожны час савецкага перыяду. Аднак, як успамінае Іван Шабановіч, спробы закрыць мячэць усё ж такі былі. «У 1950-я гады прыходзілі адказныя супрацоўнікі, але выйшлі людзі і не далі, — расказвае старшыня мусульманскай рэлігійнай абшчыны. — Магчыма, не закрылі яшчэ і таму, што гэта на той час была адзіная мячэць у Беларусі, а калі пазбавіць людзей і яе, то недалёка і да бунту. Праўда, самі вернікі захаванне мячэці ў такія няпростыя ў нашай гісторыі часы іначай як цудам Божым не называюць».

ЗЛАЧЫНСТВА БЕЗ АПРАЎДАННЯ

Каб зразумець Іўеўшчыну, трэба абавязкова пабываць і ў Музеі нацыянальных культур, які адзін такі на ўсю краіну. У экспазіцыйных залах падрабязна расказваецца аб гісторыі ўсіх народаў, якія маюць дачыненне да іўеўскай зямлі. Адлюстроўваюцца іх традыцыі, культура, паказваюцца асаблівасці быту, прафесійнай дзейнасці, адбываецца знаёмства са знакамітымі продкамі і сучаснікамі.

Асаблівае месца ў музеі займае тэма Халакосту. Справа ў тым, што да Вялікай Айчыннай вайны Іўе было яўрэйскім мястэчкам (у 1938 годзе 76 % насельніцтва складалі яўрэі). Сёння ж прадстаўнікоў гэтай нацыянальнасці, на жаль, не сустрэнеш на вуліцах гарадка — у гады вайны яўрэйскае насельніцтва цалкам знішчылі фашысты.

— Горад быў акупаваны 29 чэрвеня 1941 года, — расказвае **дырэктар Іўеўскага музея нацыянальных культур Кацярына МАСКАЛЕВІЧ.** — З пачаткам вайны яўрэяў сталі перасяляць на вуліцы, якія размяшчаліся каля Рыначнай плошчы. Не хапала вады, ежы, антысанітарыя — умовы былі жудаснымі. Мужчын кожны дзень выганялі на работы. Немцы баяліся супраціўлення, таму 2 жніўня 1941 года была арганізавана першая акцыя знішчэння мірных жыхароў. Загінула 220 чалавек: у асноўным пісьменныя мужчыны, якія кіравалі абшчынай. Пасля таго было створана гета, куды зганялі яўрэяў з найбліжэйшых мястэчак. У жудасных умовах утрымлівалася звыш чатырох тысяч чалавек. Ажыццяўляліся спробы ўцёкаў, аднак многія з яўрэяў, у каго гэта атрымлівалася, не маглі знайсці сабе прыстанішча і вымушаныя былі вярнуцца ў гета. Мясцовыя жыхары, чым маглі, дапамагалі ім. Вядома, што маці старшыні (муфтыя) Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання Беларусі Абу-Бекіра Шабановіча часта падкормлівала яўрэяў і нават хавала ў сваёй хаце.

12 мая 1942 года — трагічны дзень у гісторыі Іўеўшчыны. Людзей вывелі на плошчу і павялі ў бок урочышча Стоневічы. Яны ведалі, чым скончыцца гэты шлях: чакаючы сваёй чаргі каля касцёла, людзі чулі стрэлы і крыкі людзей. Некаторым пашчасціла ўцячы, але жыць у Іўі нават пасля вайны яны не засталіся: тут загінулі іх самыя блізкія людзі. У той дзень у Стоневічах адбылася масавая акцыя знішчэння мірных жыхароў — 2524 яўрэі, ад малога да вялікага, былі забітыя каля расстрэльных ям.

Сёння, паводле апошняга перапісу, яўрэі ў Іўеўскім раёне не пражываюць. Аднак тутэйшыя памятаюць пра сваіх землякоў і рэгулярна наведваюць брацкую магілу, якая сёння завецца мемарыяльным комплексам «Стоневічы».

Вераніка КАНЮТА.
Фота аўтара і Вячаслава ЗЯНКЕВІЧА.

Шчырую падзяку за дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі газета «Звязда» выказвае намесніку старшыні Іўеўскага райвыканкама Лідзіі Вайцехаўне НОСУЛЬ.

У Іўі знаходзіцца найстарэйшая мячэць краіны.

Саламяная копія Геранёнскага замка.

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Хойникского районного потребительского общества (продавец) извещает о проведении 28 января 2022 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена продажи без НДС, бел. руб.	Задаток (5 %) без НДС, бел. руб.
	Местоположение: г. Хойники, ул. Советская, 79		
1	Стойка барная для холодильной витрины, инв. № 670	210,00	10,50
	Пристенное барное оборудование, инв. 671	312,00	15,60
3	Вешало, 2 шт., инв. 676	51,00	2,55
4	Холодильная витрина торговая, инв. 677	297,00	14,85
5	Шкаф холодильный ШВУ, инв. 680	168,00	8,40
6	Холодильный шкаф СВ 114, инв. 707	606,00	30,30
7	Холодильный шкф* 1,5 УМ, инв. 728	552,00	27,60
8	Шкаф жарочный, инв. № 583	216,00	10,80
9	Жарочная поверхность, инв. № 582	342,00	17,10
10	Холодильный шкаф, инв. № 513	192,00	9,60
	Местоположение: г. Хойники, ул. Советская, 93		
11	Витрина островная, 7 шт., инв. 1313	516,00	25,80
12	Витрина пристенная, 10 шт., инв. 1310	1 152,00	57,60
13	Прилавок-стойка, 5 шт., инв. 1311	252,00	12,60
14	Подиум, 3 шт., инв. 1312	156,00	7,80
15	Экономпанель, 8 шт., инв. 1314	132,00	6,60
16	Стеллаж раскроя, инв. 1315	156,00	7,80
17	Узел расчетный, инв. 131	198,00	9,90
18	Пенал для рубашек, галстуков, 4 шт., инв. 1317	570,00	28,50
19	Стеллаж универсальный, 6 шт., инв. 1326	702,00	35,10
20	Шкаф «Гриль», инв. 643	936,00	46,80
21	Торговое оборудование в комплекте инв. № 1318-1322: витрина-шкаф; стеллаж основной 4 е.; стеллаж прямой и приставной 7 ед.; стеллаж угловой 2 ед.; узел расчетный	1 032,00	51,60
	Местоположение: г. Хойники, ул. Колесника		
22	Печь конвекционная ДН-43, инв. 643	390,00	19,50
23	Электрическая плита, инв. № 646	150,00	7,50
24	Электрическая сковорода, инв. № 720	258,00	12,90
	Местоположение: г. Хойники, ул. Тургенева		
25	Холодильная ванна бонета, инв. 1007	516,00	25,80
	Местоположение: Хойникский р-н, д. Езапов		
28	Холодильный шкаф ШВУ, инв. 1029	204,00	10,20
	Местоположение: г. Хойники, ул. Жукова, 3		
29	Набор мебели для офиса (4 ед. в наборе), инв. № 799 в составе: стол комбинированный; стол письменный однотумбовый; тумба двухдверная; стол журнальный	477,00	23,85
30	Офисная мебель в комплекте (4 ед.), инв. № 916: стол письменный (2 шт.); стол-приставка угловой; тумба комбинированная	318,00	15,90
31	Набор мебели «Дублин» (4 ед.), инв. № 938 в составе: шкаф для документов; шкаф двухдверный для одежды; тумба двухдверная; тумба комбинированная	534,00	26,70
32	Набор мебели «Дублин» (3 ед.), инв. № 924 № 898 в составе: шкаф двухдверный для одежды; шкаф для документов; тумба двухдверная	252,00	12,60

Продавец: Хойникское районное потребительское общество, г. Хойники, ул. Колесника, 61. Контактный телефон +375296900010.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 27.01.2022 г. в 17.00.

Для участия в аукционе предоставляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность; представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять)%.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных** дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в сроки согласно заключенному договору купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости объекта. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению КТПУП «Универмаг «Слуцк» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ

(наименование – нежилое помещение)

общей площадью 70,9 кв. м, с инв. № 640/D-70035, адрес: Минская область, г. Слуцк, ул. Социалистическая, 142-61

Начальная цена без НДС **– 66 400,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 6 640,00** бел. руб.).

Сведения о земельном участке: кадастровый номер 642500000001000431, площадь 0,1595 га, общее долевое право постоянного пользования.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона реки Случь, пл. 0,1595 га.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330 000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Условия:

1. В случае отсутствия необходимости изготовления проектной документации в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество проинформировать Слуцкий районный исполнительный комитет (далее – райисполком) об отсутствии необходимости получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательских работ;

2. В случае необходимости проведения работы, требующей изготовления проектной документации:

- обратиться в райисполком для получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательских работ не позднее одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество;
- начать разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательских работ в течение 6 (шести) месяцев с даты получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ;
- согласовать с комитетом по архитектуре и строительству Минского областного исполнительного комитета предварительный проект на реконструкцию недвижимого имущества либо строительство нового с обязанностью его реализации.

3. Заключить договор купли-продажи недвижимого имущества на условиях, определенных райисполкомом.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов **www.rlt.by**. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 06.08.2021, 10.09.2021, 10.11.2021, 09.12.2021.

Аукцион состоится **31.01.2022** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.01.2022** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.
Тел. для осмотра: (801795) 55-3-98; (8029) 348-93-25.

УНП 600154568

Могилевский филиал

РУП «Институт недвижимости и оценки» информирует о проведении 02.02.2022 повторного открытого аукциона по продаже имущества РУП «Белоруснефть-Могилевоблнефтепродукт»

Лот № 1:

шасси погрузочное многофункциональное Амкодор-332С4-01, 2009 г. в., р/з IB-6 4350 (складской № по бух. учету 1010ст).

Начальная цена продажи: 18 630,00 бел. руб. с учетом НДС.

Аукцион состоится 02 февраля 2022 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, на сайте Могилевского облисполкома mogilev-region.gov.by и на сайте Организатора аукциона ino.by. Информация о предыдущем аукционе была размещена в номере газеты «Звязда» от 13.11.21

Организатор аукциона**: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by**

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ОАО «Берестовицкая ПМК № 141»** (УНП 500020631), объявляет о проведении **28.01.2022 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/01/spisok-imushhestva-berestoviczkaya-pmk_torgi_28_01_2022.pdf

Местонахождение имущества: Гродненская область, Берестовицкий район, г. п. Большая Берестовица, пер. Советский, д. 7.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ОАО «Берестовицкая ПМК №141», тел. +375293923903.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **27.01.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 18.01.22** по **17.00 27.01.22** на bankrottorg.by.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения.
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимся предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор **2 %** от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение пятнадцати календарных дней со дня проведения аукциона.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Петриковский комбинат бытового обслуживания» (продавец) извещает о проведении 16 февраля 2022 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	**Изолированное помещение с инв. № 355/D-19039280**, площадью **43,3 кв. м**, назначение – помещение бытового обслуживания населения, наименование – **комплексно-приемный пункт. Адрес:** Гомельская обл., Петриковский р-н, Мышанский с/с, д. Мышанка, ул. Городокская, 223-15	**7 219,58**	360,98

Продавец: ОАО «Петриковский комбинат бытового обслуживания», 247940, г. Петриков, ул. Гагарина, 16.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.: 8 (029) 180-22-25, 8 (033) 914-22-25, директор ОАО «Петриковский КБО» Корнийчук Виталий Валерьевич. **Шаг аукционных торгов –** 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (ОАО «Петриковский комбинат бытового обслуживания»):** р/с BY94 BAPB 3012 2460 1001 3000 0000 ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНН 4000031909, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**;

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 18 января 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 14 февраля 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

Для участия в аукционе предоставляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом имущества** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно срокам заключенного договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.

АПАРАТ НА МІЛЬЁН, А КАРЫСЦІ — ГРАШЫМА НЕ ПАМЕРАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На працягу мінулага года пры падтрымцы Гомельскага абласнога і гарадскога выканкамаў другая гомельская гарадская бальніца распрацавала праектна-каштарысную дакументацыю, правяла мадэрнізацыю памяшканняў для ўстаноўкі КТ, завяршыла пусканаладачныя работы новага абсталявання. На гэтыя мэты за кошт бюджэтных сродкаў было выдзелена больш за 500 тысяч рублёў.

Набыты рэнтгенаўскі камп'ютарны тамограф на 128 зрэзаў дае магчымасць скараціць час даследавання, паменшыць прамянёвую нагрузку на пацыента, а таксама выяўляць на больш ранніх стадыях сардэчна-сасудзістыя, анкалагічныя і іншыя захворванні.

Найноўшае абсталяванне — гэта яшчэ і даступнасць высокіх тэхналогій для гомельскіх медыкаў, магчымасць пашырыць веды і кваліфікацыю, рост аўтарытэту бальніцы.

Адкрыццё кабінета КТ у чачэрскай ЦРБ — доўгачаканая падзея не толькі для жыхароў райцэнтра і раёна, але і для Буда-Кашалёўшчыны і Кармяншчыны. Па новую медпаслугу ў Чачэрск ужо прыязджаюць пацыенты з суседніх раёнаў.

Адкрыццё кабінета камп'ютарнай тамаграфіі ў Чачэрскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Як адзначыла **загадчыца кабінета камп'ютарнай тамаграфіі райбальніцы Вольга НЯМЦОВА,** у суткі на новым абсталяванні магчыма праводзіць да ста даследаванняў. Пры неабходнасці кабінет можа працаваць кругласутачна. Для работы з высокатэхналагічным абсталяваннем падрыхтаваны неабходныя кадры.

У Чачэрскай райбальніцы была тэрмінова праведзена мадэрнізацыя часткі памяшканняў пад размяшчэнне кабінета новага рэнтгенаўскага камп'ютарнага тамографа. На рэканструкцыю і рамонт пайшло 197 тысяч рублёў бюджэтных сродкаў, цана ўласна апарата КТ — 1 мільён 287 тысяч рублёў. Новы сацыяльна значны аб'ект адкрыты пры падтрымцы Гомельскага аблвыканкама.

На ўрачыстым адкрыцці кабінета камп'ютарнай тамаграфіі кіраўніцтву вобласці за такі падарунак жыхарам раёна і медыкам падзякаваў **старшыня Чачэрскага райвыканкама Юрый ДЗЕРКАЧОЎ.** Ён адзначыў, што калектыў Чачэрскай ЦРБ вельмі згуртаваны і здольны спраўляцца з любымі цяжкасцямі, а новае абсталяванне ім дапаможа.

Старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО звярнуў увагу, што ў Беларусі, як сацыяльна арыентаванай дзяржаве, робіцца ўсё для захавання здароўя чалавека, стварэння добрых умоў лячэння і прафілактыкі хвароб. На Гомельшчыне працягваецца мэтанакіраваная работа па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы сістэмы аховы здароўя, праходзяць плановыя рамонты ўстаноў.

— Галоўны прыярытэт дзяржаўнай палітыкі — здароўе людзей. Так было заўсёды. COVID толькі ўнёс карэктывы. Мы сталі набываць больш абсталявання, прызначанага для дыягностыкі і лячэння бронха-лёгачнай сістэмы. Але гэта за дадатковыя сродкі. Плануюцца рамонты ўстаноў аховы здароўя і закупка медыцынскага абсталявання застаюцца першачарговымі пры плануванні расходу абласнога бюджэту. Так, толькі ў мінулым годзе на набыццё медыцынскага абсталявання і аўтатранспарту для медустаноў вобласці было выдзелена больш за 14 з паловай мільёна рублёў, — зазначыў кіраўнік рэгіёна.

Практычна штомесяц сістэма аховы здароўя Гомельшчыны папаўняецца новым аб'ектам. Летась быў адкрыты аперацыйны блок у трэцяй гомельскай гарадской бальніцы, педыятрычнае аддзяленне на першым паверсе шматпавярховіка ў 104-м мікрараёне абласнога цэнтра, кабінеты камп'ютарнай тамаграфіі ў Мазыры, Калінкавічах і Гомелі, фізіятэрапеўтычнае аддзяленне ў Добрушскай цэнтральнай райбальніцы.

Сёлета працягнецца будаўніцтва корпуса Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, рэканструкцыя і мадэрнізацыя памяшканняў трэцяй гарбальніцы і абласнога клінічнага шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны ў Гомелі.

Як падкрэсліў Іван Крупко, у вобласці таксама на бягучы год запланавана ўвядзенне ў эксплуатацыю яшчэ чатырох кабінетаў КТ у Брагінскім, Жыткавіцкім, Рагачоўскім раёнах і бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі ў Гомелі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота Валянціны ПРАНКЕВІЧ.

Каб не было падробак

Уніфікаваны кантрольны знак «раскажа» ўсю праўду пра тавар

А прасунуты спажывец пасля праверкі інфармацыі на знаку можа зрабіць віртуальную скаргу

Як паведаміла прэс-служба Міністэрства па падатках і зборах, з ліпеня мінулага года ў нашай краіне шэраг таварных груп падлягаюць маркіроўцы ўніфікаванымі кантрольнымі знакамі і сродкамі ідэнтыфікацыі.

Так, ужо сёння маркіроўцы гэтымі знакамі падлягаюць такія прадукты харчавання, як чай, кава, алей, ікра і кансервы рыбныя, безалкагольныя і слабаалкагольныя напоі і піва. З неядомых тавараў цяпер маркіруюцца: мыйныя сродкі для мыцця, сродкі для чысткі шкла, прыпарары, тэлевізары, планшэты, ноўтбукі, маніторы, мабільныя тэлефоны, гадзіннікі, відэакасеты, кампакт-дыскі (і іншае), а таксама вадкасці для выкарыстання ў электронных сістэмах курэння, масла маторнае і антыфрызы.

Для маркіроўкі названых тавараў выкарыстоўваюць уніфікаваны кантрольны знак, які мае двухмерны штрыхавы код DataMatrix.

А вось маркіроўцы сродкамі ідэнтыфікацыі падлягаюць: малочная прадукцыя, абутак і шыны.

Акрамя таго, з 1 сакавіка гэтага года маркіроўцы будуць падлягаць асобныя тавары лёгкай прамысловасці (паліто, паўпаліто, накідкі, плашчы, курткі (уключаючы лыжныя), вятроўкі, штармоўкі і аналагічныя вырабы мужчынскія або для хлопчыкаў, жаночыя або для дзяўчынак, бялізна пасцельная, сталовыя, туалетныя і кухонныя).

Для маркіроўкі названых тавараў выкарыстоўваецца сродак ідэнтыфікацыі, штрыхавы код GS1 DataMatrix.

Сапраўднасць тавару, якая падлягае маркіроўцы ўніфікаванымі кантрольнымі знакамі або сродкамі ідэнтыфікацыі, спажыўцы могуць праверыць з дапамогай мабільнага дадатку «Электронны знак», які дае пэўную інфармацыю аб такім тавары.

Мабільны дадатак «Электронны знак» можна спампаваць у App Store, Google Play або AppGallery. Для сканавання ўніфікаваных кантрольных знакаў або сродкаў ідэнтыфікацыі неабходна націснуць на кнопку ў акне мабільнага дадатку.

Пасля сканавання на экран мабільнага дадатку выводзіцца вынік праверкі — інфармацыя аб тавары. Такім чынам, спажывец пры выкарыстанні мабільнага дадатку самастойна можа супаставіць інфармацыю, указаную на тавары (этыкетцы), з інфармацыяй, якая змяшчаецца ў сістэме маркіроўкі, а таксама вызначыць, што тавар сапраўды прамаркіраваны законна набытымі ўніфікаванымі кантрольнымі знакамі або сродкамі ідэнтыфікацыі.

У выпадку, калі па выніках праверкі на экране не выведзены статус «Прамаркіраваны тавар», гэта азначае, што суб'ект гаспадарання не выканаў патрабаванні аб маркіроўцы ў поўным аб'ёме (звесткі аб маркіроўцы не перададзены ў сістэму маркіроўкі).

Пры вызначэнні неадпаведнасцяў інфармацый на тавары і ў мабільным дадатку (тавар у мабільным дадатку не супадае з таварам, які правяраецца, коды маркіроўкі не знойдзены ў дадатку і іншае), а таксама ў выпадку, калі пры праверцы тавару праз мабільны дадатак у спажыўца паўстануць сумненні ў легальнасці набытага ім тавару (на экране вынік праверкі падсвечаны колерам, адрозным ад зялёнага), то спажывец можа скарыстацца кнопкай «Скарга».

У гэтым раздзеле можна перадаць інфармацыю аб неадпаведнасцях альбо выяўленых самім спажыўцом парушэннях з прымацаваннем актуальных фатаграфій тавару, уніфікаванага кантрольнага знака або сродку ідэнтыфікацыі, якая будзе ў далейшым выкарыстана кантрольнымі органамі для прыняцця мер рэагавання.

Сяргей КУРКАЧ.

Класныя навіны

Інклюзія, гуманізм і талерантнасць

Мінскі дзяржаўны каледж электронікі атрымаў статус Школы міру

За сукупнасць праектаў, якія рэалізавала гэтая ўстанова адукацыі, Беларускі фонд міру прыняў рашэнне надзяліць яе такім статусам. Праект Беларускага фонду міру пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і Беларускай праваслаўнай царквы «Сетка Школ міру ў Рэспубліцы Беларусь» накіраваны на выхаванне дзяцей і моладзі на прынцыпах міру, дружбы, узаемаразумення і згоды. Каледж электронікі стаў першай прафесійна-тэхнічнай навучальнай установай у нашай краіне са статусам Школы міру.

У сваёй віншавальнай прамове **намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ** падкрэсліў, што атрымаць яго нялёгка. Гэта вынік плённай работы ўсяго калектыву — педагогаў і навучэнцаў: «Міністэрства адукацыі бачыць вельмі вялікі патэнцыял у патрыятычным выхаванні маладых людзей, выхаванні іх праз прыклады, праз тыя формы, якія фарміруюць у маладых людзей талерантнасць і міралюбнасць».

Навучэнцы і выхаванцы каледжа прэзентавалі гасцям сваю дзейнасць на дзевяці пляцоўках. У прыватнасці, расказалі пра свае праекты, якія павінны зберагчы памяць аб подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, дапамагчы ў захаванні гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, развіцці валанцёрскай дзейнасці, работы з дзецьмі, якія маюць асаблівасці развіцця. Такая работа вядзецца ў каледжы ўжо на працягу 15 гадоў.

У прыватнасці, у Каледжы электронікі першымі на постсавецкай прасторы пачалі навучаць цалкам невідушчых дзяцей. Прычым навучаюцца яны інтэлектуальным прафесіям. А ў бягучым навучальным годзе ў каледжы дадзены старт новаму эксперыментальна-інавацыйнаму праекту «Распрацоўка і апрабацыя мадэлі Цэнтра фарміравання духоўна-маральнай і інклюзіўнай культуры ва ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу». Яго асноўная ідэя — забеспячэнне ўмоў для эфектыўнага развіцця навучэнцаў з асаблівасцямі і маладых інвалідаў праз арганізацыю іх узаемадзеяння са звычайнымі аднагодкамі.

Сёння ў каледжы склаўся высокапрафесійны калектыў работнікаў. Тут займаюцца адораныя навучэнцы, пра што сведчаць 45 лаўрэатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па рабоце з адоранай моладдзю (з іх 6 навучэнцаў з абмежаванямі здароўя).

Міністэрства адукацыі падтрымлівае рэалізацыю ўстановамі адукацыі інавацыйных праектаў, заснаваных на агульначалавечых каштоўнасцях гуманізму, справядлівасці, міратворчасці, інклюзіі і талерантнасці, накіраваных на фарміраванне ў падрастаючага пакалення прававой культуры, навыкаў зносін, сацыяльнага ўзаемадзеяння і цярпімасці.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Этнаскарбонка

САКРАЛЬНАЯ СПАДЧЫНА

Прыгажосць, якая ратуе душы

У Музеі старажытнабеларускай культуры ствараецца ўнікальная экспазіцыя, прысвечаная духоўнай спадчыне нашага народа. Скульптуры, абразы іканастасаў і алтароў, царкоўнае адзенне, літургічныя прадметы знаёмяць з культурнай спадчынай праваслаўнай, каталіцкай і ўніяцкай канфесій.

У экспазіцыі можна ўбачыць старажытныя абразы, якія за стагоддзі існавання пацвердзілі сваю выключную сілу. Часам **дырэктар Музея старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Барыс ЛАЗУКА** прапануе маладым наведвальнікам проста спыніцца перад абразамі. Пастаяць, памаўчаць, падумаць... Пра добрае. Для сябе, сваіх родных, сяброў, для нашай зямлі...

А можа варта задумацца і пра тое, якую ролю гэтыя сакральныя рэчы адыгралі ў гісторыі? Пра ўсе з прадстаўленых тут абразоў кажуць, што яны намоленыя. Нават цяжка ўявіць, колькі тысяч людзей стаяла перад выявамі святых, дзякавала, прасіла, спадзявалася, малілася. Як пасля прыходу ў храм мяняліся іх думкі, паводзіны. Барыс Андрэевіч упэўнены, што захаванне сакральнага мастацтва — гэта не проста выратаванне канкрэтных прадметаў, але і душы, светапогляду чалавека. І кожны вернуты, адноўлены абраз дазваляе пакрысе рабіць добрую справу. Без веры цяжка ўявіць сталенне нашага народа, яго гісторыю. І сёння ад яе многае залежыць. Калі трымаць у сваім сэрцы, кіравацца ёй ў штодзённым жыцці, праз сіць добрага лёсу дзецям і моладзі, не забывацца пра старых і тых, каму патрэбная дапамога, грамадства будзе здаровым.

Вяртанне

Айчынная сакральная спадчына перажыла цяжкія выпрабаванні. У часы, калі афіцыйная ідэалогія пазіцыянавала атэізм як прыярытэт, ён набываў разбуральныя, агрэсіўныя формы. Гэта нашмат больш страшна, чым калі было б прынята проста не заўважаць і не звяртаць увагу на рэлігію, на творы невядомых мастакоў, што знаходзіліся ў храмах. У савецкі час, калі разбіваліся званы, паліліся і разбураліся бульдозерамі цэрквы ды касцёлы, вернікі не баяліся забіраць абразы дамоў, часам хавалі іх у гаспадарчых памяшканнях. Дзякуючы намаганням вучоных у 70-80-х гадах мінулага стагоддзя падчас шматлікіх экспедыцый было ўратавана багата твораў сакральнага мастацтва. Даследчыкі забіралі ўнікальныя творы з напаўразбураных храмаў, знаходзілі іх на гарышчах цэркваў, ператвораных у сельскагаспадарчыя склады. Літаральна машынамі вывозілі абразы, каб захаваць, закансерваваць, аднавіць.

Сёння ў Музеі старажытнабеларускай культуры захоўваецца найбуйнейшая ў краіне калекцыя абразоў (каля тысячы прадметаў). У першую чаргу тут збіраюцца творы сакральнага мастацтва, якія маюць адносіны да беларускіх земляў, да працэсаў, звязаных з гісторыяй каталіцкай, праваслаўнай і ўніяцкай канфесій.

Музей не ператвараецца выключна ў сховішча сакральнага мастацтва. Напрыклад, абраз Маці Божай Бялыніцкай летась трапіў на выставу ў Друі, прысвечаную 635-годдзю першай згадкі горада ў летапісе; пасля пабываў у Бялынічах на святкаванні ўгодкаў, звязаных з ушанаваннем гэтага цудадзейнага абраза Каронамі Папы Рымскага. А потым па просьбе магілёўскага мітрапаліта апынуўся ў Магілёве ў Кафедральным саборы. Гэты абраз знайшлі ў могілкавай капліцы ў вёсцы Сноў схаваным за печчу і закрытым дровамі. Рэстаўратар Аляксей Пуцінцаў працаваў больш за год, каб ўратаваць шэдэўр. Гэта адзін з самых старажытных вядомых спісаў, выкананы з найбольш старадаўняга абраза, на жаль, страчанага (з лёсам як у крыжа Ефрасінні Полацкай: ён знік пасля Вялікай Айчыннай вайны). За сваю доўгую гісторыю Бялыніцкі абраз займеў вялікую колькасць сведчанняў сваёй выключнай сілы. Адзін з прыкладаў таму часоў так званай Руска-Польскай вайны, у 50-я гады XVII стагоддзя. Каб забяспечыць ахову ад чужога войска, у Ляхавічы быў прывезены цудадзейны абраз. Замак тады не быў узяты, што звязалі з заступніцтвам Маці Божай Бялыніцкай. Таму ў Ляхавічах (магчыма, у той час) зрабілі некалькі спісаў з цудадзейнага абраза. Хуткасць за ўсё, узор, які сёння захоўваецца ў Музеі старажытнабеларускай культуры, якраз быў напісаны ў XVII стагоддзі.

Часта сакральная спадчына трапляла да сваіх ратавальнікаў у гаротным стане. Вельмі многія рэчы даводзілася несці асцярожна, толькі гарызантальна, на руках, як цяжкага хворага. Каб вярнуць жыццё творам сакральнага мастацтва, праводзяцца ўнікальныя «аперацыі». Некалькі гадоў таму падчас экспедыцыі ў вёсцы Вавулічы Драгічынскага раёна была знойдзена плашчаніца. Нават цяжка было разабраць кавалкі таго, што склалі ў поліэтыленавы пакет, прывезены навуковымі супрацоўнікамі з Брэстчыны: усё выглядала быццам скрутак брудных ануч. Рэстаўратар Анжаліка Міцкевіч зрабіла неверагоднае — сабрала выяву плашчаніцы і захавала не толькі аксамітную аснову, але і жывапіс, выдатную вышыўку залатымі і срэбнымі ніткамі, махры. Адзіны элемент, які быў страчаны і адноўлены на гэтым кананічным прадмеце з праваслаўнага храма — карона, што знаходзіцца над галавой Хрыста. Нанова народжаная плашчаніца заняла сваё месца ў «музейным храме» — экспазіцыя ствараецца так, каб перадаць тыповы царкоўны інтэр'ер.

Кожны абраз, які ратуецца, праходзіць кансервацыю. Спецыяльная рэстаўрацыйная рада ставіць пэўныя задачы. Увесь час спецыялістам даводзіцца вырашаць складаныя праблемы. Некаторыя абразы дапаўняліся, перапісваліся. І трэба разбірацца, напрыклад, ці варта здымаць верхні слой XIX стагоддзя, каб адкрыць выяву, зробленую раней, асабліва калі невядома, у якім яна захавалася стане. На кожны прадмет фарміруецца рэстаўрацыйны пашпарт — гэта як картка хворага, дзе фіксуюцца першапачатковы стан і вынікі абследаванняў. На некаторых абразах у працэсе рэстаўрацыі былі расчышчаны асобныя кавалкі, зроблены зандажы, дзякуючы чаму можна чытаць гісторыю таго або іншага сакральнага помніка.

Высветліць, што знаходзіцца пад верхняй выявай, дапамагае рэнтген. Рэнтгенаўскія здымкі аднаго з абразоў уразілі даследчыкаў. На верхнім слаі XVIII стагоддзя паказана ўзнясенне Хрыста, а пад ім — выява Божай Маці. Было вырашана зрабіць, здавалася б, немагчымае, — танюткую плёнку алейнага жывапісу верхняй выявы зняць і перанесці на новую аснову. Смелую і рызыкоўную ідэю па расслаенні абразоў удалося ажыццявіць дзякуючы спонсарскай падтрымцы аднаго з банкаў. Гэта быў першы такі вопыт у айчыннай рэстаўрацыйнай практыцы.

Нанову народжаная плашчаніца, якую ў знявечаным стане прывезлі з вёскі Вавулічы Драгічынскага раёна, заняла сваё месца ў «музейным храме».

Чараўнікі? Прафесіяналы? Творцы?

У музеі знаёмімся з мастаком-рэстаўратарам Юліяй Дранец, якая займаецца рэканструкцыяй царскіх дзвярэй XVIII стагоддзя — шэдэўра жывапісу, мастацкай разьбы і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Яны зоймуць годнае месца ў новай экспазіцыі, дзе будуць уключаны ў праваслаўны іканастас.

Юля раскрывае асобныя сакрэты сваёй прафесіі: «Калі працуеш з абразамі, кожны раз сутыкаешся з унікальнай рэччу. У Расіі абразы часта падпісныя, у нас гэта рэдкасць, што значна ўскладняе работу».

«Рэстаўратар павінен цудоўна разбірацца ў гісторыі сусветнага і беларускага мастацтваў, ведаць этапы, шляхі, якія прайшоў іканапіс Беларусі, як ён нараджаўся, фарміраваўся, развіваўся. Калі чалавек не мае гэтых ведаў, ён не можа адбыцца як прафесіянал, — заўважае Барыс Лазука. — Але мала проста ведаць, у якім стане павінна быць аснова, які грунт, ляўкас, фарбы, якія рэчывы выкарыстоўваць і як падпраўляць. Павінна быць душа мастака, густ, творчы талент. Гэта тая сфера, у якой майстры рухаюцца навобмацак. Часам у рабоце з абразамі перад рэстаўратарам адкрываецца быццам подых пэўнай эпохі, гістарычнай інфармацыі. Нягледзячы на тое, што мы сцвярджаем, што хрысціянскае мастацтва кананічнае, усё роўна гэтае мастацтва стваралі жывыя людзі, і яны прыўносілі адчуванне індывідуальнасці, непаўторнасці, ўласнае ўяўленне аб тым, як павінна выглядаць прыгажосць Багародзіцы, Немаўляці, якое яна трымае. Без ведаў, адчування, таленту рэстаўратар ператвараецца ў рамесніка».

Рэстаўрацыйны цэнтр

Мы завіталі і ў невялікую рэстаўрацыйную майстэрню, якая сёння дзейнічае пры Нацыянальнай акадэміі навук. Менавіта тут сёння робяцца архіважныя справы. Часам на выратаванне аднаго абраза можа ісці год і больш. Але ў Музеі старажытнабеларускай культуры захоўваюцца артэфакты з розных матэрыялаў, і да кожнага прадмета (гэта могуць быць скульптуры, тканіны, фаянс, фарфор, старадрукі, вырабы з каляровых металаў і сплаваў і г. д.) патрэбны свой падыход. Сёння неабходна зрабіць усё магчымае, каб аб'яднаць разнапрофільных спецыялістаў. Рэстаўрацыйная галіна ў Беларусі толькі пачынае развівацца. Ужо наладжана падрыхтоўка спецыялістаў, іх выпускаюць Акадэмія мастацтваў і Універсітэт культуры. Але праблема ў тым, каб захаваць гэтыя кадры ў Беларусі. Рэстаўрацыйныя работы — дарагое задавальненне, не ўсе музеі сёння могуць трымаць у сябе ў штаце рэстаўратара, і часта элітныя і вельмі патрэбныя ў нашай краіне кадры «губляюцца» на прасторах СНД.

Дырэктар Музея старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Барыс ЛАЗУКА.

Барыс Андрэевіч падзяліўся, што ўжо пачалася работа па стварэнні акадэмічнага рэстаўрацыйнага цэнтра пры Акадэміі навук. Выдзелена памяшканне, вядзецца яго рэканструкцыя, вызначаецца, якія майстэрні там павінны быць, ужо збіраюцца кадры, здольныя вырашаць разнастайныя сур'ёзныя рэстаўрацыйныя пытанні. Не трэба забывацца, што ў структуры Нацыянальнай акадэміі багата цэнтраў і навукова-практычных інстытутаў самага рознага профілю, працуюць высокакваліфікаваныя тэарэтыкі і практыкі, у тым ліку фізікі, хімікі, гісторыкі, мастацтвазнаўцы. Такое акумуляванне ведаў дазволіць брацца за вельмі складаныя задачы дзяржаўнага маштабу.

Шляхі да веры

Вяртанне да сваіх вытокаў, гісторыі, веры таксама можа пачынацца ў музеі, дзе людзі з розных куткоў Беларусі і госці з замежжа судакранаюцца з сакральным мастацтвам. Але сёння патрабуюцца сур'ёзныя падыходы да захавання гэтай унікальнай спадчыны і сумесная работа вучоных, рэстаўратараў, прадстаўнікоў улад і царквы.

З закінутага касцёла ў вёсцы Шылавічы Ваўкавыскага раёна ў 1990-х гадах да вучоных трапіў абраз XVII стагоддзя «Беззаганнае Зачацце» ў вельмі дрэнным стане. Ён быў прабіты ўсярэдзіне, цэнтральная дошка аказалася літаральна выламанай. Абраз быў закансерваваны. Вернікі з Шылавіч неаднаразова звярталіся ў розныя інстанцыі, у тым ліку і ў Нацыянальную акадэмію навук, і ў музей, з просьбай аб вяртанні святыні. Але падобная перадача немагчымая, бо арыгінал быў моцна пашкоджаны. Адзін са студэнтаў Акадэміі мастацтваў выканаў найдакладнейшую копію абраза, якую перадалі вернікам. Спачатку яе паказалі ў райвыканкаме Ваўкавыска, а пасля прывезлі ў Шылавічы. Абраз быў асвячоны. Для мясцовых жыхароў гэта стала вельмі значнай падзеяй. Вернікі некалькі кіламетраў рухаліся да абраза на каленях.

Такім можа быць адзін са шляхоў вяртання. Наладжаныя зносіны паміж вучонымі, свецкімі і царкоўнымі ўладамі прыносяць свой плён. У Акадэміі навук заўсёды рады бачыць прадстаўнікоў розных канфесій, вернікаў на навуковых канферэнцыях, у свой час і самі вучоныя далучаюцца да мерапрыемстваў, арганізаваных царквой. «Навука, навука аб мастацтве і аб захаванні твораў мастацтва і вера павінны рухацца на карысць людзей, зямлі, будучыні. Гэта залог і аснова годнасці, еднасці, талерантнасці», — упэўнены Барыс Андрэевіч. Ён заўважыў, як мяняецца стаўленне ў людзей да спадчыны наогул. Гады малой радзімы пакінулі след у свядомасці. Адчуваецца, наколькі бераўлівымі сталі адносіны ў моладзі да сваёй вёскі, царквы, родных мясцін. Год народнага адзінства стаў лагічным працягам гэтага. Год гістарычнай памяці — зноў жа, зварот да нацыянальных каштоўнасцяў, бо еднасць, адзінства, памяць звязаныя з іншымі, не менш значнымі катэгорыямі, без якіх цяжка ўявіць цывілізаванага чалавека, — такімі як вера і годнасць.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Навасселле ў інтэр'еры

РАТУША ДЛЯ ТУРЫЗМУ «ПАД ДАХАМ»

Пасля рэканструкцыі былы вяльможны асабняк будзе сустракаць гасцей у новым фармаце

Сталае пакаленне гродзенцаў ведала гэты будынак як гарадскі архіў. А два з паловай стагоддзі таму знакаміты італьянскі архітэктар спраектаваў яго для старасты горада Антонія Тызенгаўза. Пасля маштабнай рэканструкцыі тут будуць сустракаць турыстаў, а таксама прымаць замежныя дэлегацыі і праводзіць прэзентацыі для інвестараў і бізнесменаў. А пакуль мы разам з гідам пройдземся па ім і даведаемся аб яго мінулым: як-ніяк, будаваўся ён у эпоху каралёў і магнатаў. Тады ў Гродне з'явілася нямала знакавых архітэктурных збудаванняў, якія дайшлі да нашых часоў.

З АЎТЭНТЫКАЙ, АЛЕ ПА-НОВАМУ

Наш гід — **намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення Рэспубліканскага турысцка-спартыўнага саюза Сяргей КАЛЯДА.** Грамадскае аб'яднанне сумесна з гарадскім аддзелам спорту і турызму стала партнёрам міжнароднага праекта, у рамках якога праходзіла рэканструкцыя будынка.

Вось яго кароткая гісторыя. Двухпавярховы асабняк будаваўся як дом віцэ-адміністратара Гродна Антонія Тызенгаўза. У розныя часы тут знаходзіліся падатковае ведамства, паштовая кантора, а з 1921 года — цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў.

Новы імідж гістарычны аб'ект пачаў набываць два гады таму. І вось нарэшце з аварыйнага ператварыўся ў раскошны, варты самых высокіх гасцей. Праўда, перад тым як надаць яму новы выгляд, давялося вельмі карпатліва папрацаваць.

— Было складана, — успамінае Сяргей Каляда. — Падвал «плаваў», вада даходзіла да другога паверха. Скарысталіся сучаснай нямецкай тэхналогіяй, якая дазволіла замацаваць спецыяльным растворам канструкцыі. У падвале знайшлі вокны, аказалася, што будынак амаль на метр прасеў. Магчыма, сваю ролю ў гэтым адыграла цяжкая вапнавая плітка на другім паверсе. Усё гэта знімалі і аднаўлялі.

«Двухпавярховы асабняк будаваўся як дом віцэ-адміністратара Гродна Антонія Тызенгаўза. У розныя часы тут знаходзіліся падатковае ведамства, паштовая кантора, а з 1921 года — цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў».

Сучасныя тэхналогіі дазволілі захаваць аўтэнтычнасць будынка. Звяртаюць на сябе ўвагу нішы для скульптур. «Яны тут былі раней, — заўважае мой гід. — Мабыць, рабіліся пад нейкія скульптуры. Нішы мы пакінулі, а вось скульптур пакуль няма. Магчыма, з'явяцца з цягам часу».

АРХІТЭКТУРНАЯ ГАЛЕРЭЯ

У двухпавярховым будынку некалькі залаў для прыёмаў. Адзін з іх — сенатарскі, з масіўнымі калонамі да самога даху. З-за таго, што пакой займае адразу два паверхі, ён выглядае асабліва велічным. Мяркуецца, што тут будуць праходзіць сустрэчы, канферэнцыі, весціся перагаворы. Вядома, сюды запросяць і турыстычныя групы.

У ходзе гутаркі з маім гідам высвятляем і сітуацыю з гарадской ратушай. Сапраўды, некалі на цэнтральнай плошчы быў магістрат. Але ў XVII стагоддзі яго будынак быў разбураны, застаўся толькі вежавы гадзіннік, які дайшоў да нашых часоў і цяпер знаходзіцца на Фарным касцёле. Дарэчы, ён лічыцца адным з самых старых вежавых гадзіннікаў Еўропы, спраўна ходзіць у нашы дні — і нават з боем.

Па прыгожай мармуравай лесвіцы падымаемся на другі паверх. Увагу прыцягвае карцінная галерэя. Яна стваралася беларускімі

мастакамі падчас пленэру. Перад імі стаяла задача — паказаць на палотнах тыя старажытныя будынкі, якія датычацца эпохі Тызенгаўза. Аказалася, што такіх аб'ектаў дайшло да нашых часоў нямала. Таму і карцін атрымалася каля двух дзясяткаў.

На іх можна ўбачыць былую каралеўскую рэзідэнцыю, першую ў Беларусі медыцынскую акадэмію (пакуль на стадыі продажу), будынак пад назвай «крывая афіцына», дом Валовічаў (сёння праваслаўная епархія), сучасны тэатр лялек, будынкі на плошчы Тызенгаўза, у тым ліку былы лямус (цяпер тут месціцца рэстаран), дом рамеснікаў (цяпер музей гісторыі Гарадніцы), былы Дом масонаў (будынак належыць ГрДУ). Усе аб'екты адлюстроўваюць архітэктуру другой паловы XVIII стагоддзя.

ДОЙЛІД У БРОНЗЕ

Многія дамы будаваліся па праектах вядомых архітэктараў. Напрыклад, праект адноўленай ратушы выканаў знакаміты італьянскі архітэктар Джузэпэ Сака. Яго вобраз у бронзе прадстаўлены побач з будынкам. Па словах Сяргея Каляды, старажытны дойлід абмяркоўвае план гарадской забудовы з самім каралём. Абедзве фігуры зроблены ў рост чалавека.

Беларускі скульптар Вадзім Мацкевіч неяк расказаў, што для скульптурнай кампазіцыі бронза адлівалася ў самай лепшай сталічнай ліцейні. Уся работа заняла паўгода. Праўда, былі і пэўныя складанасці. Напрыклад, не адразу ўдалося зрабіць фігуру патрэбных памераў — на вуліцы пасля майстэрні выявіліся некаторыя агрэхі, якія прыходзілася карэкціраваць. Аднак кампазіцыя за кароткі час займела папулярнасць у якасці фотазоны. Спрыяе гэтаму і лаўка, на якую можна прысесці побач са шляхетнымі асобамі.

СЦЕНЫ ПАД ГРОДЗЕНСКІЯ ПАЯСЫ

Адзін з пакояў новага аб'екта прысвечаны гродзенскім мануфактурам. І тое таксама невыпадкова. У свой час віцэ-адміністратар, ці, проста кажучы, староста Антоній Тызенгаўз надаваў вялікае значэнне развіццю прамысловасці. Ён заснаваў у Гродне 15 мануфактур. Адна з іх спецыялізавалася на ткацтве шаўковых вырабаў, у тым ліку гродзенскіх паясоў.

Гэта былі высокамастацкія творы, якія не саступалі знакамітым слуцкім паясам. Ткалі іх залатымі і срэбнымі ніткамі толькі мужчыны, прычым майстроў прывозілі ажно з французскага Ліона. Паясы былі дарагія, таму заказаць іх маглі толькі вяльможныя асобы, у тым ліку і каралеўскія.

— Гэтае майстэрства, як і самі паясы, незаслужана забытае, — заўважыў падчас экскурсіі Сяргей Каляда. — Таму мы вырашылі нагадаць пра яго і аформіць сцены адной залы менавіта ўзорамі знакамітых гродзенскіх паясоў. Вядомы мастак Аляксандр Сільвановіч падарыў ім, можна сказаць, другое жыццё, праўда, праз сваю мастацкую тэхніку. І фарбы падабраныя адпаведныя тым ніткам, якія браліся для вырабу пояса, — яны не яркія, а спакойных, пастэльных тонаў.

Што датычыцца інтэр'ера, ён таксама адпавядае агульнаму стылю аб'екта. Праўда, ніякіх эскізаў, якія б пралілі святло на былое ўбранне, не знайшлося. Таму арыентаваліся на аналагі каралеўскіх залаў. Тое самае і з дызайнам саміх пакояў. Барэльефы, балконы, калоны, лесвіцы, столь, сцены — усё гэта сабрана з розных элементаў шляхетных асабнякоў. Будынак будзе прыдатны як для афіцыйных сустрэч, так і для культурных падзей. У прыватнасці, будзе працаваць музычны салон. Дарэчы, сваё майстэрства падчас адкрыцця аб'екта прадэманстраваў ансамбль скрыпачоў дзіцячай музычнай школы.

ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ МІЖСЕЗОННЯ

Аб'ект пасля рэканструкцыі будзе перададзены гарадскому аддзелу спорту і турызму. Менавіта гарадскія ўлады будуць займацца арганізацыяй турыстычнага руху і ўсіх мерапрыемстваў. Праграма распрацоўваецца ў Гродзенскім гарвыканкаме. Вядома, усё падпарадкавана ідэі захаваць элементы гарадской ратушы і турыстычнага аб'екта. Дарэчы, з цягам часу ёсць намер адкрыць у падвальных памяшканнях рэстаран.

Навіны на гэты конт ёсць і ў Сяргея Каляды. Ён паведаміў, што рыхтуецца працяг праекта адносна згаданай гістарычнай эпохі. Яго назва — «Мелодыі Тызенгаўза». Мяркуецца, што праект дасць пачатак сістэматычным штотыднёвым вечарынам, якія калісьці ладзіліся з удзелам вядомых музыкантаў, артыстаў, архітэктараў, мастакоў.

— Галоўная мэта нашых праектаў — развіццё турызму. Ідэю мы перанялі ў Чэхіі. У міжсезонне там працуе даволі папулярны праект «Турызм пад дахам». Калі чэхі ўбачылі, што паток турыстаў у «мёртвы» сезон падае, яны актыўна заняліся рэканструкцыяй аб'ектаў для прыёму гасцей. Групу сустракаюць, вязуць у былы асабняк ці палац, праводзяць экскурсію, частуюць, ладзяць музычнае прадстаўленне. Мы таксама можам так зрабіць, — лічыць Сяргей Каляда.

Пакуль гэта новы кірунак у турыстычнай дзейнасці Гродна, але, здаецца, даволі перспектыўны. Як бачым, і адзін асобна ўзяты будынак можа даць нямала ўражанняў нават самым патрабавальным турыстам.

«Праект адноўленай ратушы выканаў знакаміты італьянскі архітэктар Джузэпэ Сака. Яго вобраз у бронзе прадстаўлены якраз побач з будынкам».

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

❍ Тым часам

У Гродне наведвальнікаў чакае калядная выстава ікон

У горадзе над Нёманам адкрылася калядная выстава ікон, аўтары якіх — дзеці. Выстава стала вынікам трохгадовай працы.

Іконы, як вядома, пішуцца доўга, тут шмат дэталяў і ўзораў, асабліва важна правільна прапісаць лікі святых. Фарбы таксама незвычайныя — тэмпера, дзе ў аснове натуральныя матэрыялы, напрыклад, яечныя жаўткі — гэта старажытная тэхніка ў жывапісе. Гатовы вынік пакрываюць аліфай. Па праваслаўных канонах, святыя малююцца з німбамі, у старажытных адзеннях, а ўсе прадметы, якія прысутнічаюць на іконе, як і колеры, нясуць у сабе сакральны сэнс. Юныя аўтары ўпэўнены: іх работы нашмат большыя, чым малюнкі, іх можна чытаць нібы кнігу.

Выстава, вядома, незвычайная. І дзеці да яе паставіліся вельмі трапятліва. Нехта выконваў работу паўгода, нехта — год. Гэта нельга параўнаць з карцінамі, краявідамі. Тут шмат дэталяў. Ікона, вядома, цалкам адрозніваецца ад усіх прац, якія робяць у выяўленчых студыях, мастацкіх школах.

Дзеці дапоўнілі выставу калядным батлейкамі, якія таксама выраблі сваімі рукамі. Дарэчы, галоўную інсталяцыю са сцэнай нараджэння Хрыста, якую да свята ўстанавілі перад храмам, таксама змайстравалі ў дзіцячай іканапіснай студыі. Яна ўжо дзевяць гадоў існуе пры Свята-Пакроўскім кафедральным саборы. Работы вучняў не раз перамагалі ў нацыянальных і міжнародных конкурсах.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 28 января 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 20 % (лоты №№ 5, 6); на 40 % (лот № 7, 9, 10); на 50 % (лот № 4); на 55 % (лот № 1); на 60 % (лоты № 2, 3, 8) по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
Условие продажи: 1. Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества, на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортного средства (лот №4) (автотехники и механизмов), а также, в случае необходимости, получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3.** После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельного участка (лот № 1)**, необходимого для обслуживания предмета аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Продавца			
1	**Капитальное строение с инв. № 320/С-38828** общей площадью **1 745,6 кв. м**, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **участок автодорог для обслуживания помещений ГПК (**составные части и принадлежности: Б-Автодороги, въезды с бетонным покрытием, А-Автодороги, въезды с асфальтобетонным покрытием, В-Дорожки и площадки). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2, территория ОАО «Белфа». **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321850100001004545** общей площадью **0,4976 га** – для строительства и обслуживания домика дежурного с благоустройством (земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения). **Право аренды (доля в праве 307/1000)**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/25, участок № 2	**39 852,00**	3 985,20
2	**Автоклав 3.2М2,** инв. № 142-42733	**14 640,00**	1 464,00
3	**Автоклав 3.2М2,** инв. № 142-42734	**14 640,00**	1 464,00
4	**Автомобиль ZAZ LANOS, 2010 г. в., рег. № 9533 ВТ-3** , цвет – темно-бордовый металлик, тип ТС – легковой седан, № кузова (рамы) Y6DTF69Y090224536, пробег- 221 637 км., состояние- на ходу	**3 000,00**	300,00
5	**Станок горизонтальный консольно-фрезерный НГФ-110Ш3,** инв. № 142-41819, год выпуска 1980	**1 152,00**	115,20
6	**Станок вертикально-сверлильный 2Н135,** инв. № 142-41131, год выпуска 1978	**2 208,00**	220,80
7	**Реактор для приема латекса (в количестве 6 ед.),** инв. №№ 142-4122-2.2, 142-4123-2.2, 142-4124-2.2, 142-4125-2.2, 142-4126-2.2, 142-4172	**58 752,00**	5 875,20
8	**Лифт грузовой № 800779,** инв. №150-5285, г/п 500 кг., год выпуска 2001	**4 752,00**	475,20
9	**Блочная турбогенераторная установка с противодавлением пара «Кубань 0,5 ПАЗ»,** инв. № 141-5094, год выпуска 1997	**80 598,58**	8 059,86
10	**Блочная турбогенераторная установка с противодавлением пара «Кубань 0,75 ПАЗ»,** инв. № 141-5087, год выпуска 1999	**94 867,57**	9 486,76

Продавец: ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин, 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (044) 797-88-07, заместитель директора по техническим вопросам – Галактионов Виктор Владимирович. **Шаг аукционных торгов – 5 %.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** Р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 18 января 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 26 января 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи до **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 22.09.2021 г. № 182 (29551); от 16.10.2021 г. № 200 (29569).**

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.

Организатор аукциона – ООО «Реалконсалтинг», ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. г. Минск, 220015, РБ, тел./факс: + 375 (17) 256-61-35 Адрес проведения аукциона: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701. Продавец – ЗАО «МТБанк»

Повторный открытый аукцион № 19/21 по продаже здания в г. Бобруйск и помещения в г. Минск

Дата аукциона	Последний день приема заявлений	№ лота	Предмет аукциона	Местонахождение	Начальная цена продажи лота, USD* с учетом НДС	Сумма задатка по лоту, руб.
22.02.22 в 11.00	**17.02.22 до 17.00**	1	Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-2631, общая площадь – 364,7 кв. м, назначение – здание многофункциональное, наименование – здание многофункциональное, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000006000791 площадью 0,0394 га. Административное здание	Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 36	**94 080**	9 000,00
22.02.22 в 11.00	**17.02.22 до 17.00**	2	Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-70774007, общая площадь – 181,9 кв. м, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение. ТЦ «Глобо»	г. Минск, ул. Уманская, д. 54, пом. 106	**216 000**	12 000,00

Открытый аукцион № 01/22 по продаже административного помещения в г. Бобруйск

22.02.22 в 12.00	**17.02.22 до 17.00**	1	Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-6817, площадь – 48,7 кв. м, назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение с пристройкой. Административное помещение	Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Советская, 69-5	**20 000**	3 000,00

** расчеты за приобретаемое имущество производятся в белорусских рублях по курсу НБ РБ на дату заключения договора купли-продажи*

Порядок проведения и выбора победителя	Открытый аукцион на повышение начальной цены проводится с шагом аукциона в размере **5 процентов** от начальной стоимости предмета аукциона. Победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае когда в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее – единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия
Прием заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8
